Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 04 (2750) Год LIV | Беласток, 25 студзеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Формула поспеху: W = (2+L+F)·O/U

Бельскі — дванаццаты!

Фота Кароля Цеплуха

Дэлегацыя бельскага белліцэя з міністр адукацыі Катажынай Галь

Бельскі беларускі ліцэй ужо неаднаразова трапляў на спісак перадавых ліцэяў ва ўсёй Польшчы ў рэйтынгу звышгімназічных школ, праведзеным адукацыйным месячнікам „Perspektywy" і газетай „Rzeczpospolita". Месцы паасобных школ капітулам гэтага рэйтынгу вызначаліся паводле вышэйпрыведзенай формулы, дзе *W* — паказчык алімпійскіх поспехаў, *L* — лік вучняў школы, якія ў III этапе здабылі званне лаўрэата ў 2007 годзе, *F* — лік вучняў школы, якія ў III этапе здабылі званне фіналіста ў 2007 годзе, *O* — лік алімпіяд, у якіх вучні дадзенай школы здабылі ў III этапе званне фіналіста ці лаўрэата, *U* — лік вучняў дадзенай школы ў 2006/2007 школьным годзе. Лаўрэаты ў гэтым рэйтынгу лічацца падвойна ў параўнанні да фіналістаў. Моцна прэміюцца школы за поспехі ў кожнай чарговай алімпіядзе. Поспехі школ мераюцца прапарцыянальна да ліку вучняў. Сёлета бельскі белліцэй апынуўся на 12 месцы ў краіне, а на другім месцы ён у Падляшскім вяводстве. Гайнаўскі белліцэй быў 5 у нас і 65 у краіне на 300 адзначаных ліцэяў.

— Наш ліцэй неаднойчы лічыўся адным з лепшых у ваяводстве, трапляў і на спісак лепшых у Польшчы, — цешыцца дырэктар Андрэй Сцепанюк, сам таксама выпускнік гэтай шаноўнай школы. — Аднак такога поспеху, як сёлета, даўно ў нас не было. У 2001 годзе наш ліцэй апынуўся быў на восьмым месцы, і лічыўся першым у ваяводстве, але тады прымалі мы ўдзел у 4 алімпіядах. У параўнанні з мінулагоднім рэйтынгам перасунуліся мы на 33 месцы вышэй! Трэба будзе зноў пазмагацца, каб утрымаць такі аўтарытэт! Нашы вучні прымалі ўдзел у дзесяці прадметных алімпіядах, у якіх мелі мы 2 фіналістаў і 6 лаўрэатаў цэнтральнага ўзроўню. Некаторыя нашы вучні прымалі ўдзел у некалькіх алімпіядах, становячыся ў іх і лаўратамі, і фіналістамі. Варта пералічыць імёны вучняў, дзякуючы якім заўважаны нашы поспехі. Гэта ў алімпіядзе рускай мовы — лаўрэат Яраслаў Кірылюк, фіналісты: Марыя Федарук, Юліта Сушч, Анэта Горнава, у алімпіядзе „Лёсы палякаў на ўсходзе пасля 17 верасня 1939 года" — фіналіст Марыюш Такаюк, у алімпіядзе экалагічных ведаў — фіналісткі Кацярына Здановіч і Юліта Сахарчук, у алімпіядзе ведаў пра Польшчу і сучасны свет — лаўрэат Тамаш Зінкевіч, у алімпіядзе ведаў пра Еўрасаюз — фіналіст Тамаш Зінкевіч, у біялагічнай алімпіядзе — фіналістка Аляксандра Дораш, у геаграфічнай — фіналіст Лукаш Трашчотка, у навуталагічнай — лаўрэат Лукаш Трашчотка, у гістарычнай — фіналіст Тамаш Зінкевіч, у хімічнай — фіналістка Юстына Мельнік, у алімпіядзе беларускай мовы — лаўрэаты Анна Хількевіч, Аляксандра Лаўранюк, Караліна Ігнацюк, фіналісты — Юльянна Дораш, Юліта Сахарчук, Пётр Сцепанюк, Ганна Мордань, Эвеліна Лапінская, Івона Маркевіч, Наталля Журавль, Магдаліна Дамброўская, Наталля Дмітрук.

Урачыстае ўручэнне сертыфікатаў кіраўнікам адзначаных школ наступіла якраз на Каляды, на першы дзень свята, 7 студзеня, у Варшаве, ва Універсітэце. З бельскага белліцэя паехала з дырэктарам цэлая дэлегацыя — чатырох вучняў і двух настаўнікаў. Апавясціў пачатак важнага для ўсяе краёвай адукацыі мерапрыемства славуты гурт трубачоў з Галоўнай школы сельскай гаспадаркі (СГГВ) у прысутнасці міністр адукацыі. Сертыфікаты атрымалі пятнаццаць найпешых школ у краіне.

— Прафесар Тамаш Барэцкі, старшыня капітула, у час, калі я падышоў да яго, каб атрымаць сертыфікат (ён адзін з заснавальнікаў СГГВ), — з усмешкай успамінае дырэктар белліцэя, — звярнуўся да мяне: „А гэта знаеш?" — і заспяваў першую страфу *Касіў Ясь канюшыну*...

Міра ЛУКША

Фота Кароля Цеплуха

Сертыфікат дырэктару Андрэю Сцепанюку ўручаюць намеснік галоўнага рэдактара газеты „Rzeczpospolita" Пётр Габрыель і старшыня капітула праф. Тамаш Барэцкі. „Касіў Ясь канюшыну!" — на добры плён праспявана было бельскім белліцэістам

Імя Расія ☞ 2

Марк ЦЫБАРТ

Вельмі добрай ініцыятывай расійскага тэлебачання стаў плебісцыт „Імя Расія" („Имя Россия"). Справа ў тым, каб з ліку вялікіх дзеячаў Расіі (спартсменаў, палітыкаў, вучоных, пісьменнікаў і т.п.) выбраць дванаццаць найбольш заслужаных для Расіі імён, якія могуць стаць узорам для сённяшніх грамадзян Расіі. Ідзе пра выбар імя-сімвала сённяшняй расійскай дзяржавы, яе актуальнага становішча, яе патрэб і перспектыў недалёкай будучыні...

„Рацыя" без навагодніх феерверкаў! ☞ 2

Ганна КАНДРАЦЮК

— „Рацыя" была лепшай! — спрачаецца беластоцкая пенсіянерка ў футры. Разам з сяброўкамі з Беласточка чакае гарадскога аўтобуса, які завязе іх у царкву. Сёння 14 студзеня. У кожнай жанчыны на галаве капялюш, у руках густоўная сумачка, словам, „элеганцыя-францыя". Як і належыць у Новы год. Размаўляюць пра ўчарашні вечар і Sylwestra po raz drugi...

Музыка жыцця і Эндзі Уорхал ☞ 12

Ганна КАНДРАЦЮК

Багдан Дудко і Тыднёвік „Ніва"

запрашаюць

23 студзеня ў „Esperanto Cafe" ў 18.00

(Гарадскі пляц у Беластоку) на ПРАМОЦЫЮ КНІЖКІ

„40 і 4 вершы пра каханне"

(аўтар: Багдан Дудко)

ды канцэрт мінскага барда — ЗМІЦЕРА БАРТОСІКА

9 770546 196000

Імя Расія

Вельмі добрай ініцыятывай расійскага тэлебачання стаў плебісцыт „Імя Расія” („Имя Россия”). Справа ў тым, каб з ліку вялікіх дзеячаў Расіі (спартсменаў, палітыкаў, вучоных, пісьменнікаў і т.п.) выбраць дванаццаць найбольш заслужаных для Расіі імён, якія могуць стаць узорам для сённяшніх грамадзян Расіі. Ідзе пра выбар імя-сімвала сённяшняй расійскай дзяржавы, яе актуальнага становішча, яе патрэб і перспектыў недалёкай будучыні. З ліку паўтысячы кандыдатур найбольш галасоў атрымалі Аляксандр Пушкін, Фёдар Дастаеўскі, Дзмітрый Мендзялееў, некалькі ўладароў Расіі і палітыкаў XX стагоддзя. У канчатковым галасаванні першае масца атрымаў св. Аляксандр Неўскі, другое — Пётр Сталыпін, трэцяе — Іосіф Сталін.

У першую хвіліну гэты вынік узрадаваў мяне. Мой фаварыт заняў другое месца, саступіўшы толькі святому князю. Але калі прыйшоў час на разважанні, то не было мне ўжо так весела. Святога Аляксандра прапанаваў мітрапаліт Смаленскі і Калінінградскі Кірыла, цяперашні месцаблюсціцель патрыяршага прастола. У Расіі наглядаецца вяртанне да рэлігіі, сам уладыка рэкамендаваў гэтага кандыдата, іншыя не аспрэчвалі кандыдатуру, дык „масы” прагаласавалі ў перакананні, што трэба выбраць царкоўнага кандыдата, каб не адставаць ад модных тэндэнцый. Так што высокае месца акурат гэтага кандыдата мяне цешыць, але аб нічым не сведчыць.

Сталыпін сваё другое месца абавязаны ў галоўным дасканалай рэкамендацыі вядучага тэлешоў Мікіты Міхалкова, да таго прадэманстраванай гледачам у апошніх днях галасавання. Не хочацца мне верыць, што гэты сапраўды небывалы рэфарматар і дзяржаўны дзеяч раптам стаў такім папулярным у краіне, дзе дзесяцігоддзямі яго аплёўвалі або замоўчвалі. Змены ў свядомасці мас праходзяць вельмі павольна і не хочацца мне верыць, што цяперашнія расіяне аж так ведаюць і цэняць Сталыпіна. Аднак дзякую тым, чые галасы вынеслі Пятра Аркадзьевіча на другое месца.

Аднак сапраўдным пераможцам плебісцыту аказаўся — паводле мяне — Іосіф Сталін. Тут нельга гаварыць пра выпадковасць, эмацыйную, але неабгрунтаваную падтрымку, адабрэнне і разуменне. Гэтая асоба для многіх расіян (але ці толькі расіян?..) надалей застаецца блізкай, заслужанай і няслушна абняслаўленай. Гэта ж наш таварыш Сталін! Дзякуючы яму свяціла сонца, дзеці і жанчыны смяяліся, краіна мацавалася і перамагала ў войнах, не было хуліганства, наркаманіі, беззмястоўных палітычных дыскусій, ну а мы самі якімі ж тады былі маладымі і прыгожымі! Сталін — частка нашай долі, жыцця нашых бацькоў, кумір лявакоў усёй Еўропы, гонар і краса ўсяго народа і дзяржавы, якой жа тады магутнай! Вялікі чалавек, увесь час акружаны жменькай малых кар’ерыстаў, якія ўсе свае злачынствы ўмела перавялі на рахунак таварыша Сталіна. Пераможны правадыр, якому пасля смерці ўчынена была яўная крыўда. Ну, урэшце здарылася нагода, каб яе выправіць!

Што ж гэтая постаць мае супольнага з сённяшнім днём і будучыняй Расіі? Надта многа. Бо калі б сёння кіраваў тав. Іосіф Вісарыёнавіч, то ніхто не адважыўся б не слухацца Расіі, навязваць ёй штосьці, не плаціць, шкодзіць на міжнароднай арэне. Менавіта Сталін, Сталін, і яшчэ раз Сталін! І Сталіна нам трэба, каб у краіне запанаваў парадак, каб людзям плацілі за працу, каб цэны не раслі, ну і каб не было ніякіх алігархаў, бо ж страўнікі ўва ўсіх нас аднолькавыя! І яшчэ каб дармовымі былі газ, электраэнергія, школа, кватэра, адпачынак у Артэку і гарадскі транспарт. Бо нам жа гэта абяцалі, і гэтае нам належыцца.

Калі мае меркаванні слушныя, то сітуацыя сведчыць аб тым, што ў расійскага народа ў далейшым зламаны хрыбет. Непатрэбная яму воля, свабода выказвання думак і поглядаў, а падняцца з рабскіх кален таксама мала каму хочацца. Толькі каб карыта было поўнае. А калі — не дай Бог — меў бы ў Расіі адрадзіцца такі сталінскі скансэн, то нявесела стане таксама і ў яе наваколлі, у тым ліку і на Беларусі, і ў нас. А такі паўтор з часоў маладосці я ўжо не хацеў бы перажываць.

Сама ідэя плебісцыту — знакамітая! Мільёны людзей выслухалі рэкамендацый пасобных кандыдатаў, сотні тысяч новых людзей праявілі цікавасць да айчыннай гісторыі. А гісторыя — як усім вядома — настаўніца жыцця. Такім чынам значна вырас лік свядомых грамадзян, а гэта важная і патрэбная кожнай дзяржаве справа. Раптам аказалася таксама, што айчына заўсёды мела рэфарматараў унутраных адносін, людзей, якія пераймаюцца значэннем і якасцю айчыны-маці, што неабавязкова актывісты савецкай эпохі мусяць быць бездакорнымі рыцарамі, што можна выйсці па-за зачараванае кола „герояў нашых часоў”.

Хацелася б мне, каб нешта падобнае запрапанаваць палякам. Цікава, ці ўмелі б яны выйсці па-за зачараванае кола Яна Паўла II, Пілсудскага, Касцюшкі і Каперніка...

Марк ЦЫБАРТ

„Рацыя” без навагодніх феерверкаў!

— „Рацыя” была лепшай! — спрачаецца беластоцкая пенсіянерка ў футры. Разам з сяброўкамі з Беласточка чакае гарадскога аўтобуса, які завязе іх у царкву. Сёння 14 студзеня. У кожнай жанчыны на галаве капялюш, у руках густоўная сумачка, словам, „элегацыя-францыя”. Як і належыць у Новы год. Размаўляюць пра ўчарашні вечар і *Sylwestra po raz drugi* .

— А для мяне больш падабалася Радыё Беласток, — не пагаджаецца іншая. Яе „Рацыя” падвяла, бо змоўкла ў час, калі найбольш хацелася весяліцца, пасля шампанскага. Значыць, у першую гадзіну ночы... — І феерверкаў не было!

Праз момант уяўляю як радыё „Рацыя” пускае ў эфір тону феерверкаў. Апошні закід падабаецца найбольш, хоць, здаецца, накіраваны ён у адрас лянівых слухачоў...

Усё ж прыемна слухаць жывы каментарый пра беларускія медыі ў публічным месцы. Яшчэ сорак-пяцьдзесят гадоў назад гэтыя ўжо польскамоўныя элеганткі таксама вялі ажыўленыя бяседы ў Новы год. Праўда, тады найчасцей каментавалі гагатушныя фокусы: хто ў каго павесіў на браме калоду, хто да каго высыпаў сцежку попелам, каму ўкралі брамку або ўцягнулі сані на страху. Зараз у нас, па пэўных прыкметах, медыйнае грамадства. Людзі гавораць пра тое, што іншыя сказалі ў тэлебачанні ці па радыё. У гэтым годзе мясцовыя польскамоўныя прэса і тэлебачанне цалкам завязалі рот. Яны якраз чамусьці загаварылі пра сексотаў у праваслаўным асяроддзі. Быццам спецыяльна, каб за святочным сталом народ дзерся і сварыўся. Нашы людзі не дурныя — не пайшлі на правакацыю. Я не пачула ніводнага крытычнага слова ў бок іерархаў. Ні ў царкве, ні пад царквой ніхто не крануў „гарачай” тэмы. Наадварот, вернікі, як заўсёды, маліліся за іх даўгавечнасць...

Новы год я сустракала з „Рацыяй”. Праўда, перадача стаміла мяне. Мой закід у бок вядучых, якім не ўдалося збудаваць святочнай атмасферы. Магчыма, пашкодзіла тут дурная беларуская дабрыня — дагадзіць усім на свеце. Ідзе пра песні. Дастаткова было пазваніць і заказаць пажаданы шэдэўр. Вядучыя механічна пакарысталіся ўзорам падляшскіх канцэртаў пажаданняў. Таму ад пачатку верх узяла выпадковасць, якая, як вядома, не заўсёды вядзе да шчаслівага канца. Першае і апошняе месца заняла папса, неабавязкова беларуская... Часам, здавалася, што перадача адрасаваная да жыхароў Тамбоўскай вобласці! Аж хацелася пайсці на правакацыю і заказаць нейкую антыбеларускую дрындушку.

Нягледзячы на акіян сімпатыі для Радыё „Рацыі”, іх музыка пачала стамляць. У адрозненне ад элегантакі на прыпынку, я была рада, калі перадача спынілася а першай гадзіне ночы...

Каб не заснуць да поўначы, я засяродзілася на званках і допісах ад слухачоў. У медыйна-віртуальным свеце наша Беласточчына жывая, бадзёрая, добрая. У Шчодры вечар можна было даведацца пра ўсё на свеце. Менавіта: хто з кім тусуецца, хто з’ехаў за мяжу, хто ляжыць у шпіталі, хто з кім неўзабаве будзе жаніцца... Апрача ведаў з памежжа плёткі, слухачы пакідалі каштоўныя інфармацыі, напрыклад, што ў Завыках (гэтую вёску апісаў Збігнеў Рэдлінскі ў „Канапельцы”) асталося пяць праваслаўных і ўсе яны яшчэ „трымаюцца” свайго, пра тое, што ў падбеластоцкіх Студзянках жыве яшчэ беларускі дух і працуе калектыў „Мальвянкі”, што ў Трасцянцы няма клуба і моладзь таўчэцца ля магазіна. Хоць сярод пажаданняў пераважалі асабістыя ноты, час ад часу чуліся зычанні грамадскага кшталту. Парафіяне віншавалі сваіх бацюшкаў і матушак, дзеткі — настаўнікаў, працаўнікі — шэфаў, жыхары — усіх *mieszkańców* (слова жыхар у нас не прыжылося) вёскі або мястэчка Нарва. Мяне ўзрушыў званок з Кузніцы, у якім віншавалі працаўнікоў магазіна „Бядронка”, што па вуліцы Радзымінскай у Беластоку. Да гэтай пары месца мне ніяк не асацыявалася з Радыё „Рацыя”! Вядома, найбольш пажаданняў атрымалі самі вядучыя перадачу. І, як здаецца, захвалілі іх насмерць! Страшэнна не хапала ім дыстанцыі, жартоўных каментарыяў, хоць бы ў свой адрас. Як вядома, найбольш здароўя і шчасця прыносяць добры гумар і смех. Пра гэта ведалі нашы продкі, якія дзеля здароўя (чытайце, смеху) бушавалі ўсю ноч, спраўляючы „гагатуху”!

Ганна КАНДРАЦЮК

Вачыма еўрапейца

Адзін з дзесяці

Я — аматар тэлевізійных віктарын, гэтых, што разварушваюць шэрыя мазгавыя клеткі. Несумненна, ад пару ладных гадоў да вартых пахвалы належыць турнір „Адзін з дзесяці”, які паказваецца ў публічным тэлебачанні (цікава, усё ж, калі прападзе ён з антэны, уступаючы спусташальнай канкурэнцыі?). Калі толькі магу, сядаю перад тэлевізарам і ўслухоўваюся ў пытанні, якія там ставяцца незвычайна гаваркім і галантным Тадэвушам Шнуком, майстрам слова, якім звычайна павінен быць радыёжурналіст штодня. Так менавіта было ў праваслаўную Куццю. У той дзень пад вечар я дастаў з халадзільніка і размарозіў карпа, якога частку якраз на гэты дзень пакінуў сабе ад каталіцкай Вігіліі. Падсмажыў, паставіў на стол і засеў у фатэль. Смакаваўшы карпа, пільна ўслухоўваўся ў пытанні, якія ставіў Тадэвуш Шнук, стараючыся, як заўсёды, быць хутчэйшым і лепшым у адказах, чым мае сапернікі ў тэлебачанні. Аж тут прагучала пытанне:

— У Беластоку — трынаццатая гадзіна, а якая будзе ў Варшаве?

Я ўсміхнуўся сам сабе, бо з фатэля маёй беластоцкай кватэры патрактаваў гэта як жарт. Тым не менш, каля трыццацігадовы ўдзельнік турніра, які паходзіў з аднаго з гарадоў у заходняй Польшчы, пасля рэгламентаваных трох секунд адказаў:

— Адзінаццатая.

Збянтэжаны вядучы міла і без злаславасці адказаў толькі:

— Ды не. Такая самая. Трынаццатая.

Калі я пачуў гэты адказ, костка каляднай рыбкі амаль не застрагла мне ў горле. Вядома, факт, што якраз такое пытанне і такі адказ прагучалі ў маім улюблёным тэлетурніры „Адзін з дзесяці” ў праваслаўную Куццю, гэта, несумненна, выпадак.

Тым часам, пры нагодзе, прыгадаўся мне мой першы двухтыднёвы зімнік амаль трыццаць пяць гадоў таму — у Бялцы-Татшанскай. Была гэта мая першая самастойная паездка па-за родны беластоцкі дом. На пачатку я цешыўся, што на ўласныя вочы ўбачу горы. Аднак аддаленасць ад мамы і бабулі спрычынілася да таго, што на другі дзень я захварэў; пачаткова нават падазравалі ў мяне жаўтуху. Праз пару дзён, калі мінула хвароба-туга, разам з іншымі дзецюкамі пайшлі мы на экскурсію. Па дарозе сустрэліся нам сапраўдныя горцы, сапраўдныя, бо апранутыя ў свае строі. Памятаю, як мы іх групкай акружылі, дакраналіся да іхніх гафтаваных цёплых кубракоў, дзівіліся, што так дзіўна яны гавораць, неяк інакш зацягваюць. Адзін з горцаў спытаўся, адкуль мы самі. Старэйшы ад мяне калега сказаў:

— З Беластока.

— А ці гэта праўда, што там па вуліцах шпацыруюць белыя мядзведзі? — радасна распытваў горац, падмірґваючы да сваіх кампаньёнаў, якія невядома чаму пасміхаліся.

Старэйшы мой сябра, выразна знерваваны, дакінуў:

— Так, так, яшчэ і паўночныя алені!

Вяртаючыся да ўспамінаў з зімніка ў Бялцы-Татшанскай і пры нагодзе каляднага адрэзка „Аднаго з дзесяці”, здаецца мне, што нічога не змянілася. Беласток бывае для некаторых (для шмат каго?) белай плямай на карце. Без сумненняў, неабходная яму прамацыйная кампанія і зразумела, што самога абмяркоўвання які лагатып горада лепшы — не хопіць. Незалежна ад змен, якія без сумненняў у Беластоку праводзяцца, перш за ўсё гандлёва-транспартна-ўрбаністычнага характару, я ўсё не ведаю, што мела б быць ягонай прыметай, якая б паўплывала на тое, што хацелася б сюды прыязджаць, жыць тут, працаваць ці інвеставаць. Поўнай яснасці наконт гэтага жадаю беластоцкім уладарам у 2009 годзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Драўляны Тадзя

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ



Іду па вёсцы Крушыняны. Вёска распаложана паблізу рэчкі Нятупы, на ўскраіне знаходзячыхся па-над ёю лугоў, лясоў і пагоркаў (што расцягваюцца ад вёскі ў паўднёва-заходнім напрамку) — вышэйшыя груды даходзяць да 161 метра над узроўнем мора. Іду пешшу, зусім не пазайздросціўшы галоўнаму ніўскаму пешаходу, адно аўтобуса назад у Беласток сёння не будзе. Вядома, не адчуваю таго ўзроўню ад марской вады, ды ўжо ад нятупскай вільгаці пачынае ламаць мяне ў касцях. Ды што там — прыехала я сюды не каб наракаць, а каб знайсці чалавека ў вёсцы, пра якую вядома, што роўна 330 гадоў таму, 12 сакавіка Ян III Сабескі надаў яе татарам-ліпкам разам з суседнімі вёскамі Нятупай, Лужанамі і часткай Панятовіч. Пасаджаныя мусульмане ваявалі на польскім баку ў вайне з туркамі. У Крушынянах, апрача 45 іншых сем'яў, асеў быў на пастаяннае жыхарства палоўнік Самуэль Мірза Крачоўскі, які ўратаваў жыццё каралю ў бітве пад Парканамі. У дарозе на сейм у Гродне кароль заехаў быў да Крачоўскага ў Крушыняны. У вёсцы жылі і тады, і сёння, разам з ліпкамі і праваслаўныя, і каталікі. Я сёння магу зайсці ў мячэць з канца XVIII стагоддзя, і на мусульманскі мізар, падзівіцца на найстарэйшыя надмагільныя пліты з канца таго ж XVIII стагоддзя і, не жыўшы адным чыстым духам, магу зайсці да Джэнэты з блізкім прозвішчам Багдановіч ды пачаставацца смакоццем з таксама свойскім імем „перакачэўнік", які стаў ужо еўрапейскім тутэйшым знакам. Але я іду да аднаго чалавека, якога ўжо... няма, як сотняў адышоўшых на іншы тутэйшы бок. А пытацца трэба пра яго ў жывых.

А гэты жывы — як урослы ў свае дошкі, што ляжаць сціртай на сваім падворку, заглыблены ў свае думкі. Гэтыя дошкі, здаецца, цяпер зусім непатрэбныя — бліжэй вуліцы высіцца вясёла-зялёны акуратны дом, на падворку парадак. Задуманы дзед з выразным, шляхетным тварам быццам мяне пазнае, бо і адразу, пакуль азвуся я, пытаецца крыху па-панібрацку, чысцюсенька беларускай мовай: „А каго ты шукаеш?.. А... ён кавалём быў!.."

Дзед носіць прозвішча такое ж самае, як і славуты каваль і народны лекар, а імя ў яго таксама свойскае — Тадзя.

— Ён быў нармальны, Кастусь, для мяне. Каму ён добры, каму благі... Жыццё перажыў парадачна... Паважны ён быў.

І пра сябе:

— Я з гэтае хаты. Дом мой — сорак пяты. Я тут радзіўся, 25 сакавіка 1928 года, і тут дажываю. Адышлі мая матка, і сястра пасля яе 33 гады. Ужо пяты рок як яе няма. І я адзін астаўся, да таго калекі, без нагі! — Тадзя Пятэльскі адгортвае калашыну і паказвае стаўбунястую кульшу, з харошай драўніны, пакрытай пацінай мінулых гадоў. Ад уражання гоцаю каля яго на дошкі.

— Правае нагі не маеце? Цяжка аднаму.

— Цяжко то цяжко. Рэнту маю... А як яе я, нагу сваю, страціў? Армовец прастрэліў! Міліцыя напусціла. Мела замах на каго іншага зрабіць. Трапіла на мяне. Я ведаю, на каго яны чатавалі. Было гэта ў 1950 годзе. Прынялі ў ОРМО пятнаццацігадовага хлопца; яго бацька быў гмінны сакратар. Далі хлопцу страшнае рускае ружжо, такое высокае, я пасля даведаўся, як дзейнічае гэты карабін: ён не мае гвінта ў ствале, і там, дзе ўлятае куля, там вырывае! І мне ад косткі аж па калена вырвала нагу.

І давядзецца растлумачыць мне, вырачыўшай вочы, ад пачатку, як Тадзю з ціхай, спакойнай вёскі Крушыняны па свеце насіла ў ваеннай і пасляваеннай завірусе. Як амаль усіх яго аднагодкаў.

— Узялі мяне на прамусовыя работы, пятнаццацілетняга смаркача, у Сілезіі, за Тарноўскімі Гурамі сем кіламетраў

за нямецкага часу

гэта звалася Фрыдрыхгібнэ. Пару месяцаў было добра. Падружыў я быў з хлопцам аж з-пад Станіслава, з Украіны. Была там і яго сястра, у добрага гаспадара. Сказаў мне мой калега, каб уцякаць, бо пагінем. Ад'ехалі пяць кіламетраў. Ідзем, ідзем, свет вялікі, невядома куды ісці. Меркавалі да якогасьці прыстанку дайсці, сесці і ехаць. Ідзем, мост. І адкуль той узяўся: адразу па-нямецку: „Ці вы тут працуеце?" Мой сябра па-нямецку добра гаварыў. Паклікаў паліцыянт другога, параіліся, і вядуць нас на жандармерыю, пратакол спісалі і нас — у лагер! Паслалі нас у Кендзежын, быў па нямецку Гайдэбрэк. Голад, бяда... Гэта ўжо быў 1944 год. Трапілі мы пад бамбёжку. Разяў рот, кажа сябра, бо апонкі ў вушах табе папэнкаюць! Лупілі па нас — адкуль ім было ведаць, што мы, не фашысты, у лагеры! Кінуліся ўцякаць ад фронту ўсе важныя з таго „пэгееру", куды нас ганялі рабіць, у Нямеччыну. Наш дырэктар маёнтка, шпэктар на яго казалі, меў там радзіну. А яго назад, завялі яго ўва ўстанову, каб на абарону ішоў. Яшчэ з намі развітаўся, прасіў прабачэння ў нас, сам заплакаў. Можна сказаць, што мы засталіся там самі па сабе. Прыляпіліся да мяне якіясь хлапчукі-немцы. Кажуць, Тадак, паглянь, пакінулі тут карабін і цэлая скрынка амуніцыі ёсць. Я калісь любіў пастраляць, вядома, дзяцюк. „Будзем страляць!" — цешыцца нямецкая дзецярня. Добра, што я не страляў. Слуп стаяў як згэтуль да бярэзіны. Кажу, страляй у гэты слуп, цікава, ці яго праб'еш. Прабіў! І так стралялі, мы, смаркачы, аж тут бяжыць якісь лахман, з крыкам: паказвае руку. Я кажу, што не страляў. Пабег той па паліцыю. Нямецкія хлапчукі сказалі, што я не страляў. Усё ж зацікавіліся, што я тут раблю, загадалі прыйсці назаўтра на жандармерыю. Шпэктара ўжо забралі былі, а нам кажуць старэйшыя: уцякайма, бо яшчэ нас на акопы пашлюць! І а пятай гадзіне, яшчэ цёмненька, адтуль выйшлі. Ой, з паўтара месяца

як *ваўке* шляліся!

Той найстарэйшы, што з намі быў (яму было з 45 гадоў), меў *падэйсце* да людзей, умеў дагаварыцца, і мы ішлі за ім, то нас пераначоўвалі, давалі што паесці, хоць самім цяжка людзям было. Калі б не ён, не ведаю, што я, малы, зрабіў бы. Дахаты ішлі. Ён меў хату блізка, бо на Шлёнску, а мне ж трэба было сюды, у Крушыняны. Пару дзён у гэтага чалавека пабыў, пасля рушыў далей адзін. Яшчэ і тут была цяжкая дарога, бо да Варшавы досыць хутка дабраўся, хоць бы што, на цягніку добры кавалак. Стаў ён трыста метраў да Варшавы, чыгуначнік кажа: „Далей не едзем!" І мы пайшлі. Я ішоў з савецкім салдатам, які ехаў дахаты — пусцілі яго былі ў водпуск, пэўна, заслужаны быў, у мундзіры. Спыніў ён машыну, забраў і мяне. Я дзыг! у самаход. Пераехалі Варшаву... Ой, якая Варшава была збітая! Ні аднаго цэлага муру не ўгледзеў! Два дні, дзве ночы шляўся я па разбітай Варшаве. Адзін кажа чалавек: глянь, стаіць лакаматыў, на ўсход пэўна пойдзе. Ідзі, на ўсход — хутчэй дахаты будзе. Пусцілі. Дзяўчына ехала ў Седльцы, яшчэ пачаставала мяне кавалкам булкі, такой добрай... Прыехалі ў Чаромху. Я высеў — баяўся, каб „туда", на ўсход мяне не завезлі! На лакаматыве заехаў у Бельск. А з Бельска транспарт ішоў на Саколку... А стуль ужо пяшком прыйшоў, хоць бы што. Меў я ўжо 17 гадоў на канец вайны.

Чаго было на Захад

падавацца, за братам? Ці не было працы ў Саколцы ці Беластоку? Тадзя зноў заехаў аж на другі канец Польшчы, ужо з выбару. Тадзеў брат пісаў у кожным лісце: прыедзь, прыедзь, паробіш, заробіш!

— Але там жыла і маміна сястра намнога ад яе старэйшая, так што яе дачка была маёй хрышчонай. Прыехаў яе сын, і яшчэ мяне падбухторыў. Я з плачам ад'язджаў. Быццам спадзяваўся, што стуль вярнуся без нагі. А мне варажэйка-татарка тут варажыла. І таму сваяку (праз 20 гадоў у турме яго „клявіш" ключамі забіў), учапілася паваражыць і мне. „А што табе, плаціць трэба?" Толькі разлажыла карты, і раз — у карты, раз — на мяне. Тадзю, кажа, што такое, ні то гроб, ні то што драўлянае якое... Два гады да гэтага стаяла гэта ў картах!

От, што мае быць — не выкруцішся ад гэтага! Чатавалі на брата — ён п'яны на міліцыі два разы ў падвале быў... Таму маладому армоўцу быў загад страляць, пэўна, напалохаць таго, за кім сачылі. А глянь, як у вайну ўсё было пабратэрску! Ці рускі, ці паляк, ці чэх — зыдуцца, і памогуць. А што то парабілася?! Збегліся людзі, і ў крык: што вы гэтаму хлопцу зрабілі! Мяне нават выпіўшым ніколі не бачылі, я быў такі спакойны хлопец! Вызваў быў той армовец майго брата з-за плота (я не дачуў, каго кліча), я азваўся, а ён нічога, толькі — бах! мне па нагах! Мне адно скура засталася, нагу адарвала!.. Рэшта адно і целепалася як на шнурку. Адно кроў цёплая бухала. Думаў я са сходкаў зысці, зняць пасак, перацінуць, каб спыніць кроў, ды страціў прытомнасць. Людзі кінуліся на таго армоўца, мала яго не задушылі. Скорую вызваў капрал-памежнік. А тут міліцыянты ды армоўцы хапаюць за насілкі: *Zostawcie go!* Людзі вырвалі мяне ад іх. Дык яны — да машыны, а кіроўца — на газ! Хацелі справу замяць. Медсястра-манашка, што пры аперацыі была, казала, што такога рэшата яшчэ не бачыла, як я быў пашаткаваны. Былі ўпэўнены, што на сто працэнтаў сканаю ў той вечар. А забачце, я і дзісяй здаровы... Я, вэдлуг здароўя, калі б не нага, дык чуюся амаль без змен. А тады я... вярнуўся на кулях. Заплакала мама... Так было...

— Можа, пабілі, што вы — згэтуль?

— Хіба ж не, не пазналі б. Дарэчы, я католік.

Маўчым, седзячы на дошках. Гаспадар папыхвае таннай махоркай. — Гляну я на гэту хату... — уздыхае Тадзя Пятэльскі. — Я адзін. А такая радзінка была — чатырох братоў у мяне, дзве сястры... Во якая жытка! Я па смерці мамы з сястрой Марысяй тут 33 гады арудаваў. Ой, як я перажываю пасля яе смерці! Зямлю здаў за рэнту. Дайшло мне яшчэ 140 злотых за Нямеччыну, амаль 100 за інваліднасць... Якась жыву.

З Чаромхаўскай гміны

Гмінная статыстыка...

У Чаромхаўскай гміне напрыканцы снежня (29.12.2008) пражывала 3 718 жыхароў. У мінулым годзе нарадзілася 19 дзетак, а зарэгістраваных было 49 пахаванняў. На месца сталага пражывання прапісалася ў Чаромхаўскую гміну 15 чалавек, а выпісалася — 37 грамадзян. Прыведзеныя лічбы паказваюць, што грамадства колішняга чыгуначнага вузла не толькі старэе, але і больш людзей пакідае свой родны кут у пошуках лепшага быту...

Ганаровыя донары

Раённае праўленне Польскага чырвонага крыжа даслала чаромхаўскаму самаўраду заяву, у якой рэкамендавала ўзнагародзіць ганаровых донараў, якія вылучыліся ў акцыі здачы крыві. Да іх належаць: Івона Саўчынская (адзіная жанчына) — 5 000 мілілітраў крыві, Лявон Шымусюк — 30 000 мл (найбольш аддаў), Уладзімір Баранаў, Яўген Салінскі і Раман Бышчук — па 12 тыс. мл ды Ежы Дарошчук, Ежы Клімовіч, Марыюш Струк і Марыюш Світальскі аддалі па 6 000 мл. Рэчавыя падарункі з найлепшымі пажаданнямі перадаў ганаровым донарам войт Міхал Врублеўскі 29 снежня 2008 года на XV сесіі Рады гміны.

Навагодняя ёлка

14 снежня дзесяцёра дзетак з тэрыторыі Чаромхаўскай гміны ўдзельнічала ў навагодняй ёлцы ў гасцініцы „Галэмбёўскі" ў Беластоку. Мерапрыемства арганізавала Таварыства „Дрога". Кожны ўдзельнік імпрэзы, як і яго сямейнікі, атрымалі ад Дзеда Мароза святочныя падарункі. Як паведамілі арганізатары, не ўсім выпала на долю гуляць пры ёлцы (абмежаванае месца ў гасцініцы). Таму сямейнікі чаромхаўскіх дзетак, удзельнікаў беластоцкіх святкаванняў, падарункі атрымалі ў Гміннай управе, а было іх 24. Таварыства „Дрога" прызначыла гэтым разам 34 падарункі для дзетак са шматдзетных сем'яў з Чаромхаўскай гміны. **(УС)**

Гайнаўка

Новыя тратуары

Улады Гайнаўкі дбаюць пра гарадскія вуліцы, каб былі яны бяспечныя, роўныя ды прыгожыя. У 2008 годзе новыя тратуары атрымалі вуліцы Касідлаў, Паркавая, Мілкоўскага (ад скрыжавання з вул. Врублеўскага да вул. Заячай), Паддольная (на 200-метровым адрэзку ад вул. Паўднёвай да вул. Доўгай) ды невялікі адрэзак вуліцы Арміі Краёвай.

Найбольш задаволеныя з пракладкі тратуарных плітак гайнавяне, якія жывуць па вуліцы Паддольнай. Тут тратуара ніколі не было. Яны маюць надзею, што сёлета тратуар будуць будаваць далей, а гэта больш за кіламетр, аж да вуліцы Дольнай. **(яц)**

З гісторыі беспрацоўя ў Гайнаўцы (2)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

З восені мінулага года на Гайнаўшчыне радыкальна пачаў мяняцца рынак працы. Фінансавы закалот, што летам крануў у першую чаргу людзей, якія індывідуальна, або карыстаючыся дапамогай фондаў, былі залежнымі ад здзелак на розных біржах свету або хацелі браць крэдыты, не прадвяшчаў яшчэ цяжкасцей, што так хутка могуць непасрэдна спасцігнуць прадпрыемствы на Гайнаўшчыне і спрычыніцца да звальнення людзей з работы або высылкі іх у водпуск. Хаця паслядоўнасці сусветнага гаспадарчага крызісу на Гайнаўшчыне найбольш адчулі работнікі дрэваапрацоўчай прамысловасці, дык крануў ён таксама машынную прамысловасць і іншыя меншыя прадпрыемствы.

Высылаюць у водпуск або звальняюць

Праз апошнія гады многа айчынных прадпрыемстваў інвеставала ў машынны парк і ў новыя тэхналогіі (добрым прыкладам гэтаму з'яўляюцца група „Фортэ", якая ў гайнаўскую фабрыку мэблі заінвеставала апошнім часам ажно 30 мільёнаў злотых, ці „Пронар" з Нарвы, які часта мадэрнізуе сваю прадукцыю і выкарыстоўвае новыя тэхналогіі). Гэтыя прадпрыемствы разлічвалі, што попыт на іх вытворчасць будзе працягвацца, але сусветны гаспадарчы крызіс перашкодзіў у рэалізацыі іх планаў. Попыт на іх прадукты выдатна паменшаў.

Зараз дырэкцыі многіх польскіх суполак вымушаны скарачаць або мяняць прадукцыю, што патрабуе выдаткавання дадатковых сродкаў, і пачалі звальняць работнікаў. Усе паслядоўнасці крызісу, якія тычацца беспрацоўя, можна разглядаць як у адносінах да усёй Польшчы, так і да Гайнаўшчыны. У нашай краіне масавыя звальненні ў бліжэйшым часе плануюць ажно больш за трыста прадпрыемстваў і хочуць звольніць з работы каля 30 тысяч чалавек. Паводле спецыялістаў па рынку працы, да канца гэтага года ў Польшчы ў аптымістычным варыянце работу можа страціць 300-400 тысяч чалавек, а ў песімістычным — нават каля 600 тысяч работнікаў. Ужо даўно таму спецыялісты па рынку працы дайшлі да вываду, што самай вялікай вартасцю кожнага прадпрыемства з'яўляюцца яго кваліфікаваныя кадры, а не дарагія машыны. Таму ўласнікі суполак, калі яшчэ не пагражае ім банкруцтва, найчасцей стараюцца затрымаць асноўныя кадры, прапануючы ім водпускі або працу на паўстаўкі. Польскія кансультанты па рынку працы мяркуюць, што ў нашай дзяржаве лік беспрацоўных можа большаць на працягу двух гадоў. Айчынныя прадпрыемствы, у тым ліку і гайнаўскія, позна ўзяліся за рэдукцыю коштаў прадукцыі, калі многія суполкі з заходніх краін ужо канчаюць гэты працэс, што дазволіць ім прайсці праз гаспадарчы крызіс з меншымі стратамі.

Пра цяжкасці з продажам прадукцыі ці пра планаваныя звальненні часта цяжка даведацца непасрэдна ад дырэкцый прадпрыемстваў і таму застаецца карыстацца інфармацыяй ад работнікаў. Гайнавянін, заняты ў нарваўскім „Пронары", раней меў цяжкасці, каб пайсці ў водпуск на больш чым на некалькі дзён. Прадпрыемства з Нарвы было завалена заказамі. Для тых работнікаў, якія рашаліся працаваць

Ляўкоўская суполка з абмежаванай адказнасцю „Будаўнічая кераміка", хаця мае заказы, таксама вымушана была абмежаваць прадукцыю цэглы. Аднак прадпрыемства не рашылася на групавае звальненне часткі работнікаў, бо хоча затрымаць кваліфікаваныя кадры, каб пры лепшай кан'юнктуры зноў разгарнуць прадукцыю

дадаткова па суботах, згодна з законам плацілі больш чым за работу ў іншыя дні. Восенню мінулага года гэты ж пронараўскі работнік быў высланы ў водпуск (магчыма, што трэба было выбіраць тыя дні, якія не выбраў летам), але і зараз, калі пішу гэты артыкул, таксама знаходзіцца ў водпуску. Кажа ён, што цяжэй, чым раней, прадаваць пронараўскую вытворчасць. Іншыя работнікі нарваўскага прадпрыемства таксама пацвярджаюць, што плошча ў „Пронары" запаўняецца машынамі. Ёсць ужо таксама індывідуальныя звальненні і ў „Пронары", але пра масавыя звальненні яшчэ афіцыйна не гаворыцца.

— Уласнік гайнаўскай суполкі, што займаецца машыннай прадукцыяй і частку сваёй вытворчасці высылае на экспарт, мае клопаты з продажам сваіх прадуктаў і звольніў частку работнікаў, — паведамляе іншы гайнавянін, спадар Марк.

— Яшчэ мы працуем у Варшаве і яе наваколлі ды абсталёўваем новазбудаваныя кватэры, але я бачу, што будова новых дамоў і кватэр спыняецца і не ведаю, што мы будзем рабіць у бліжэйшай будучыні, — кажа спадар Анатоль з Гайнаўкі, які ў прадпрыемстве свайго брата кіруе працай работнікаў, што кладуць гайнаўскія паркеты.

Вядома, што ў дрэваапрацоўчых суполках складана прадаць вырабы і з вялікай верагоднасцю можна сказаць, што некаторыя работнікі страцілі там ужо працу. Аднак цяжка даведацца ад іх уласнікаў аб кадравых зменах. Некаторыя працадаўцы прымалі работнікаў на часовую працу і здаралася, што не рэгістравалі іх.

Гаспадарчы крызіс у вялікай ступені спасціг будаўнічую прамысловасць ва ўсёй краіне, што спрычынілася да абмежаванага запатрабавання на ўсе будаўнічыя матэрыялы, якія раней вельмі многа падаражэлі. Ляўкоўская суполка з абмежаванай адказнасцю „Будаўнічая кераміка", хаця мае заказы на сваю вытворчасць, таксама вымушана была абмежаваць прадукцыю цэглы. Аднак прадпрыемства не рашылася на групавае звальненне часткі сваіх работнікаў, бо хоча затрымаць кваліфікаваныя кадры, каб пры лепшай кан'юнктуры ізноў разгарнуць прадукцыю. Можна спадзявацца чарговых звальненняў у шматлікіх дрэваапрацоўчых прадпрыемствах у Гайнаўскім павеце. Ведаю аб індывідуальных звальненнях у адной з суполак у Кляшчэлеўскай гміне. Калі кіраўніцтва групы „Фортэ" з г. Остроўў-Мазавецка рашылася звольніць звыш 180 работнікаў гайнаўскай фабрыкі мэблі, мусіла грунтоўна перадумаць сваё рашэнне і паведаміць аб звальненнях Павятовую ўстанову працы ў Гайнаўцы. Індывідуальныя звальненні можна апраўдоўваць парознаму і не трэба іх рэгістраваць.

Калі гаварыць пра Гайнаўшчыну ў цэлым, дык асабліва сталі абмяжоўваць сваю прадукцыю тыя прадпрыемствы, якія экспартавалі свае прадукты. Пасля таго, як патаннеў злоты, іх прадукцыя стала на замежных рынках больш канкурэнтнай і павінны яны атрымліваць больш заказаў. Аднак сусветны гаспадарчы крызіс паніжае запатрабаванне на прадукты хатняга ўжытку, у тым ліку і на гайнаўскую мэблю ці пронараўскія машыны. Паніжэнне цаны тут не можа быць вырашальным і таму некаторыя прадпрыемствы на Гайнаўшчыне абмяжоўваюць прадукцыю, высылаюць работнікаў у водпуск або проста звальняюць іх з работы і чакаюць лепшага часу. Калі да гэтага дабавіць сезонныя зімовыя звальненні работнікаў у будаўніцтве, дык атрымаецца, што ў Гайнаўскім павеце апошнім часам заўважальна пабольшаў лік беспрацоўных. Да абмежаванняў у прадукцыі і звальненняў працаўнікоў на Гайнаўшчыне спрычыняюцца таксама абвастрэнні ў выдачы крэдытаў, бо прадпрымальнікам цяжка фінансаваць больш складаную прадукцыю без банкаўскай падтрымкі.

— Мы будзем старацца дапамагчы знайсці работу звольненым з фабрыкі мэблі, але з гэтым будзе цяжка, бо, маючы на ўвазе фінансавы крызіс, іншыя прадпрыемствы будуць асцярожнымі, каб прымаць новых людзей на працу, — заявіў бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, які праз магістрацкіх работнікаў мае намер дапамагаць звольненым з працы. Аднак магчымасці магістрата абмежаваныя і ў час крызісу патрэбныя больш станоўчыя дзеянні ў падтрымку беспрацоўных у маштабе дзяржавы, якія тычыліся б таксама жыхароў Гайнаўкі і наваколля. У канцы кастрычніка ў Павятовай установе працы ў Гайнаўцы зарэгістраваных было 1428 беспрацоўных. Звольненыя з гайнаўскага „Фортэ" і іншых прадпрыемстваў работнікі павялічылі ўжо гэтую колькасць і будуць павялічаць, бо звальненні ў „Фортэ" і іншых суполках расцягнуты ў часе. Прадбачваецца, што Павятовая ўстанова працы будзе дапамагаць перакваліфікоўвацца звольненым работнікам. Аднак не хопіць перакваліфікавацца з работы ў дрэваапрацоўчай, ці машыннай прамысловасці напрыклад на гасцінічную дзейнасць, але трэба яшчэ знайсці працу ў нейкім гатэлі, а такіх устаноў у Гайнаўцы мала. У Белавежы ёсць гатэлі, але ў іх працуюць свае работнікі. Напэўна частка беспрацоўных з Гайнаўшчыны паедзе шукаць новую работу ў большых гарадах Польшчы або рване ў заходнія краіны. Найчасцей будуць гэта маладыя людзі, гатовыя цяжка працаваць ва ўмовах разлукі з сям'ёй. Аднак частка людзей будзе шукаць новую работу на месцы і многія маглі б яе знайсці, калі б былі зрэалізаваныя ў Гайнаўскім павеце запланаваныя інвестыцыі.

Пётр Байко — бібліёграф

„Бібліяграфія Белавежскай пушчы" — цыклічнае выданне, якое дазваляе лепш арыентавацца ў багатай літаратуры, прысвечанай Белавежскаму нацыянальнаму парку і Белавежскай пушчы. Змяшчае яно пералік навуковых публікацый, напісаных поўнасцю або часткова на аснове матэрыялаў з тэрыторыі Белавежскай пушчы, папулярна-навуковых і публіцыстычных прац, надрукаваных асобнымі выданнямі або ў перыёдыцы (са штотыднёвікаў пачынаючы). Апублікаваны да гэтай пары пералік белавежскай літаратуры пачынаецца з 1948 года. Аўтарам апошняга тома „Бібліяграфіі Белавежскай пушчы 2001-2005", які выйшаў друкам напрыканцы мінулага года, з'яўляецца Пётр Байко — чалавек шматлікіх талентаў, вядомы нашым чытачам галоўным чынам як карэспандэнт. Лесніка па адукацыі, журналіста, гісторыка, краязнаўцу, аўтара кніг па гісторыі Белавежы пры нагодзе выхаду навейшага тома „Бібліяграфіі Белавежскай пушчы" спыталі мы пра яго чарговае зацікаўленне — бібліяграфічную справу.

Пётр Байко

— ***Якая гісторыя ў бібліяграфіі Белавежскай пушчы?***

— Першы спісак белавежскай літаратуры саставіў праф. Ян Ежы Карпінскі. Ахопліваў ён 478 публікацый і быў надрукаваны ў 1948 годзе ў перыядычным выданні „Ochrona Przyrody" („Ахова прыроды"), які выходзіць у Кракаве. Спісак гэты быў у цэласці аднатаваны ў першым томе бібліяграфіі за перыяд да канца 1966 года, якую апрацаваў д-р інж. Чэслаў Аколаў. Таму праф. Карпінскі падаецца як сааўтар гэтага тома.

Чарговыя тамы бібліяграфіі выходзілі ў гадах: 1976 (за перыяд 1967-1972), 1983 (1973-1980), 1991 (1981-1985), 1997 (1986-1990), 2007 (1991-1995) і 2008 (два тамы за перыяды 1996-2000 і 2001-2005).

Аўтарам тамоў бібліяграфіі да канца 2000 года быў д-р інж. Чэслаў Аколаў.

Варта яшчэ ўспомніць, што адзін том бібліяграфіі быў выдадзены ў Беларусі. У 1985 годзе мінскае выдавецтва „Ураджай" выпусціла том „Беловежская пуща. Аннотированный библиографический указатель отечественной литературы (1835-1983 г.г.)" аўтарства Міхаіла П. Кавалькова, Сяргея С. Балюка і Мікалая І. Буднічэнкі. Том гэты ахоплівае 1859 публікацый на рускай і беларускай мовах. Усе яны былі аднатаваны ў бібліяграфіях, выдаваных Белавежскім нацыянальным паркам.

На падставе дагэтуль выдадзеных тамоў можна падлічыць, што белавежская літаратура на канец 2005 года ахоплівае амаль 19 000 пазіцый.

— ***Калі Вы сталі займацца бібліяграфічнай справай?***

— Бібліяграфіяй я пачаў займацца, калі Чэслаў Аколаў адышоў на пенсію. Было гэта ў студзені 2003 года. Я дагэтуль працаваў у Прыродазнаўчым музеі, а ў красавіку 2005 года перайшоў у Навуковую лабараторыю БНП, як дапаможны працаўнік. З працай над бібліяграфіяй я звязаны з паловы сямідзесятых гадоў, бо праз увесь гэты час дапамагаў Чэславу Аколаву яе складаць. Сам зрэшты вышукваў шмат публікацый, якія потым Аколаў аднатоўваў у паасобных тамах. Чатыры тамы я перапісаў на пішучай машынцы, падрыхтоўваючы іх да друку. А ў свой том я ўвёў інавацыі: 1) пры загалоўках, з якіх цяжка дадумацца, пра што ідзе гутарка ў публікацыі, даю на канцы паясненне пра змест; 2) дабавіў персанальны індэкс, які дае магчымасць лёгка адшукаць канкрэтнага аўтара ці асобу, пра якую пішацца.



— ***Раскажыце пра бібліяграфічную кухню — як збіраеце матэрыялы, хто Вам дапамагае і т.п.***

— Якая кухня ў складальніка бібліяграфіі? Перш за ўсё праверка ўсіх друкаваных матэрыялаў, якія пападаюць у рукі. Затым праверка перыёдыкі і кніжак, якія трапляюць у бібліятэку Белавежскага нацыянальнага парку і іншыя навуковыя бібліятэкі ў Белавежы. Шмат беластоцкай прэсы я купляю за свой кошт. Зараз шмат магчымасцей дае інтэрнэт. У ім можна знайсці часопісы, якія маюць электронны варыянт, а якіх не знойдзецца ў аніводнай белавежскай бібліятэцы. Ёсць таксама электронныя тэматычныя бібліяграфіі. Шмат звестак пра белавежскія публікацыі мне ўдаецца сабраць ад паасобных аўтараў, у непасрэдных з імі зносінах. Я проста больш-менш ведаю, хто можа пісаць і хто піша пра Белавежскую пушчу. Выкарыстоўваю таксама прэсавыя выразкі, якія трапляюць у Белавежскі парк. Карыстаюся таксама дапамогай былога аўтара бібліяграфіі Чэслава Аколава і Анджэя Кэчынскага — свайго сябры з-за сцяны — навуковага працаўніка, якія падкідаюць мне час ад часу публікацыі, на якія самі недзе натрапяць. Адным словам — шмат працы, да якой трэба мець і цягу, і цярплівасць. Мне гэтага хапае, шкада толькі, што вочы ўжо слабеюць.

— ***Калі з'явіцца чарговы том?***

— Чарговы том з'явіцца не раней чым у 2012 годзе і будзе ахопліваць літаратуру за перыяд 2006-2010 гадоў. Я зараз над ім працую. Маю надзею на тое, што вочы мне дазволяць яго закончыць. А калі нішто не стане на перашкодзе, то апрацую яшчэ том за 2011-2015 гады, або прынамсі яго пачну, бо ў 2015 годзе я дасягну пенсійнага ўзросту і развітаюся з працай. У такім выпадку бібліяграфію закончыць нехта іншы.

— ***Дык жадаем поспехаў ва ўсіх галінах Вашых зацікаўленняў!***

Пытаў Віталь ЛУБА

У бібліяграфіі знойдзем загалоўкі артыкулаў, рэпартажаў і допісаў, якія былі надрукаваны, між іншым, у штотыднёвіку „Ніва" ў 2001-2005 гадах. У ёй аднатаваны публікацыі Міхала Андрасюка (2 бібліяграфічныя заметкі), Віктара Буры (5), Мацея Халадоўскага (8), Пятра Байко (8), Міры Лукшы (10), Аляксея Мароза (112), Ганны Кандрацюк (1), Аляксандра Вярбіцкага (3), Яўгена Вапы (1), Міколы Ваўранюка (2) і Янкі Целушэцкага (50).

Пётр Байко, *Бібліяграфія Белавежскай пушчы 2001-2005*, БНП Белавежа 2008, сс. 364. Тыраж: 500 экз. **(яц)**

Мінулагоднія занатоўкі

За намі 2008 год. Якім ён быў для нас, беларусаў? Чым адзначыўся ў нашым грамадскім жыцці? Вось мае некаторыя занатоўкі.

* * *

Гайнаўскія чыноўнікі з Беларускага музея спрытна, па-сяброўску „выцяснілі" беларускага дзеяча Янку Сычэўскага з ліку прэтэндэнтаў на Беларускі музей у Гайнаўцы. Да гэтай пары старшыня ГП БГКТ з гонарам адзначаў, што музей належыць Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству. Ад нейкага часу вяліся размовы і судовыя разборкі, якія давялі да таго, што пад канец 2008 г. старшыню ГП БГКТ пазбавілі права казаць „мой музей". За гэта Грамадскае аб'яднанне „Беларускі музей і асяродак культуры" на суцяшэнне заплаціла БГКТ 250 тысяч злотых. Пасля гэтага гістарычнага акта цяперашнія ўладальнікі музея паінфармавалі сваіх сяброў аб тым, што старшыня БГКТ пазбавіўся музейнага маёнтка, у які свае грошы ўкладалі беларусы Польшчы, Беларусі, ЗША і іншых краін. Аднак спадар Сычэўскі чамусьці не паінфармаваў аб гэтам сваіх членаў. Ніжэйпадпісаны прысвячае яму вось такія радкі:

Апошні мой годзік – 2008-мы –
Слёзы ліюцца з павек.
Дазволь, Белмузею,
з табой развітацца,
Дазволь развітацца навек!

* * *

У мінулым годзе чыноўнікі з Грамадскага аб'яднання „Беларускі музей і асяродак культуры" знялі з фасада музейнага будынка беларускі арнамент, які быў гонарам нашай тут бытнасці. Калі б будаўнік музея, пакойны Кастусь Майсеня, гэтае ўбачыў, то разагнаў бы суполку на ўсе чатыры бакі.

* * *

На вялікі жаль ніводзін нашага хову войт ні бурмістр не пажадалі пастарацца, каб у сваіх мясцовасцях прысвоіць вуліцам імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа. Не праявілі яны таксама ахвоты пакарыстацца законам РП, які дазваляе ўстанаўліваць двухмоўныя — польска-беларускія — указальнікі. Відаць, па завядзёнцы чакаюць загаду вярхушкі. Але дзе яна?

Віктар БУРА

Зімовая хандра

Разам з зімою да часткі людзей чапляецца сумны, паніжаны настрой — хандра. Хандра з'яўляецца відам сезоннай дэпрэсіі, якой спрыяюць халодныя кароткія дні, цёмныя доўгія ночы, неспрыяльнае надвор'е. У такіх абставінах людзі трацяць ахвоту да жыцця. Каб паправіць настрой, калісьці па вёсках сяляне збіраліся на вячоркі. Цяпер уключаюць тэлевізар.

Як змагацца з хандрай?

Трэба старацца як найчасцей бываць сярод людзей, як найчасцей бываць на двары, каб карыстацца натуральным святлом, рабіць зарадку. Зімой чалавек патрабуе даўжэй спаць, таму рэкамендуецца раней ісці на спачынак. Вельмі добра, калі ў хаце цяпло; холад — наш вораг. На зіму варта ўключыць ясныя, 150-ватавыя электрычныя лямпачкі.

Калі вы багатыя, то каб пазбыцца зімовай хандры — можаце з'ездзіць у цёплую краіну!

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Прагоніш бабра — не чакай дабра

Рэчка Лясная, што бярэ пачатак паблізу Гайнаўкі, паволі нясе сваю ваду па пушчанскіх лясах і балотах. У тым месцы, дзе яна прабягае пад бетонным мастом і вырываецца на прастору, плынь становіцца больш спакойнай, а рака — глыбакаводнай. Там пасялілася сямейка баброў. Людзі, якія праходзілі па мосце, здзіўляліся: няўжо працавітым звяркам не перашкаджае пастаянны шум снуючых па шашы машын і людскі гоман? Але бабрам было хоць бы што. Адна за адной падала спілаваная іх моцнымі зубамі альшына, павялічвалася запруда на рэчцы і раслі бабровыя домікі на вадзе.

Пешыя турысты, што бралі накірунак да Белавежскай пушчы, абавязкова спыняліся, падоўгу назіраючы як завіхаюцца на будоўлі плаціны працавітыя бабры. Але ад такога суседства з руплівымі будаўнікамі зусім нярадасным стала жыццё мясцовага лесніка, за чыім агародам абжываліся навасёлы. Усю вясну на ягоным участку стаяла вада, якой не было куды падзецца пасля бабровай запруды. Яна падтаплівала сад і дабіралася нават да веснічак.

Ляснік Сяргей любіў звяроў і птушак. Калі часам даводзілася сустрэць у пушчы бездапаможнае звераня, не праходзіў прэч. Не ўдавалася аказаць „хуткую дапамогу" на месцы — забіраў малое дахаты, лячыў сам, альбо выклікаў ветэрынара. Пэўна, з прычыны вялікай любові да лясных істот ён доўга цярпеў нязручнасці, створаныя бабрамі. Больш таго, часта хадзіў да ракі любавацца сваімі няўрымслівымі суседзямі і сачыў, каб ніхто не пакрыўдзіў звяркоў. Бабры пры з'яўленні лесніка не спяшаліся даваць нырца ў ваду. Сядзелі нейкі час на спілаваным дрэве і пільна разглядалі чалавека.

— Ну, як справы, Бабёр Бабровіч? — пытаў Сяргей у гаспадара сямейства. — Колькі сёння спілавалі альшын?

І адзначаў, што ля хаткі з'явіліся купкі вербалозу і асінніку: значыць, рыхтуюць корм на запас, збіраюцца зімаваць, радаваўся ўпотай ляснік. Вось толькі дома радасці яго зусім не падзяляла жонка.

— Усе людзі агароды садзяць увесну, а я — улетку, як дрэнная гаспадыня, — абуралася яна. — Колькі ўжо ты будзеш няньчыцца, бы малое дзіця, з бабрамі? Няўжо няма ад іх ніякага паратунку? (*працяг будзе*)

Таіса СКУРАТАВА

Гульні ў Студзіводах

Фота Ганны Кандрацюк

У які бок плыве Лясная?

Рака Лясная з выссі Белай вежы

У час зімовых канікул многія з нас наведаюць Белавежскую пушчу. Шчасліўцы наведаюць памесце Дзеда Мароза, які разам са Сняжынкай жыве на беларускім баку пушчы. У іх двор прылятаюць птушкі, прыходзяць зубры і алені. Успамін пра сустрэчу з дзікімі жыхарамі пушчы цешыць малых і старых, ён астаецца на ўсё жыццё...

Абавязкова наведайце і Камянец. Там славутая Белая вежа. Усярэдзіне будыніны XIII стагоддзя працуе музей. Вандроўка па паасобных паверхах — асаблівае падарожжа па гісторыі Беларусі. Адзначаны тут і рэгіянальныя прыкметы, характэрныя для Камянеччыны і нашай Сямятыччыны (гэта ж натуральны этнаграфічны працяг). Мне запамятаўся від з вышыні вежы. Там як на далоні бачым раку Лясную (Правую), якая выцякае з балот ля нашых Навасадаў. Гледзячы на Лясную з высі гістарычнай будыніны, захочам павандраваць далей разам з цячэннем ракі. У горным цячэнні ракі Буг Лясная сустрэнецца з Нарвай (якая таксама мае выток у Белавежскай пушчы), каб разам з Віслай уліцца ў Балтыйскае мора.

Гістарычныя веды пра рэгіён мы можам папоўніць у бібліятэцы, якая знаходзіцца побач Белай вежы. Бібліятэка названая ў гонар Усевалада Ігнатоўскага, акадэміка родам з нашых Такароў.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Бабёр з Баброўнік

Гаспадарлівы бабёр
(называюць — Нікіфор)
родам з Бобры, а прынёс
у Баброўнікі свой лёс.
Рэчка Бобра,
гэта добра,
а такая рэчка Свіслач —
вось ад радасці хоць выскач:
І мяжа — на бобраў хвост,
у Беларусь плыві наўпрост,
калі тут табе нядобра.
Ну, хай Свіслач, ну, хай Бобра,
добраму бабру — усё добра.
Ён сячэ, кладзе, будуе,
спраўна, словам, тут бабруе.
А жарэмі ў Нікіфора! —
і пакоі, і камора,
спальні (бо ж дзяцей чацвёра),
кухня (голад жа ж баброў не морыць!)...
Вось разжыўся тут бабёр,
Ужо з Баброўнік. Нікіфор!

Зося з першага „а” класа

— 15 —

У пачатку студзеня сябра Пеця адзначаў дзень народзінаў. Яму споўнілася 17 гадоў. Хлапец быў вельмі шчаслівы, у яго астаўся толькі адзін год жыцця „ў дзяцінстве”. З нагоды свята ён запрасіў сяброў у клуб *Мроў*.

Зося пайшла разам з Адай. Дзяўчына танчыла і знаёмілася з новымі асобамі. Раптам яна сустрэла яшчэ аднаго сябра з дзіцячага садка — Яся. Хлапец скончыў ужо 18 гадоў і цяпер ён сядзеў за столікам, застаўленым бакаламі піва...

— Вып’еш піва! — прапанаваў ён Адзе. Сяброўка Зосі спадабалася яму з першага погляду.

— Не, дзякую, — адмовілася Ада. Яна не любіла піва.

— Ты не ведаеш што ў жыцці добрае, — пакрыўдзіўся Ясь. — Ніякая дзяўчына не дасць хлопцу такога шчасця як гэты напой!

— Сапраўды?! — іранічна ўсміхнулася Ада.

Яська знерваваўся. Ён адвярнуўся ад Ады і пачаў чапляцца Зосі.

— Якія ў цябе нудотныя сяброўкі! — папракнуў Зосю. І дадаў: — А вы што, кніжкі чытаеце?

— Ну, чытаем...

— Дурніцы, — стаў павучаць іх Ясь. — Ці не лепш цешыцца маладым жыццём!

— А што, мы не рады? — адказала Ада.

Ада і Зося праігнаравалі хлапца і пайшлі ў іншую кампанію. Гэты жэст Ясь перажыў балюча. Ён купіў яшчэ пятнаццаць бакалаў піва і намаўляў усіх напіцца — нібыта за здароўе Пеці.

— Відаць, ён жлукціць піва як конь ваду, — падумала ўголас Зося, — ці не сапсуе сабе галавы?!

— А такі прыгожы хлапец! — Ада пашкадавала Яся. І дадала: — Відаць, у такі спосаб ён кампенсуе паразы з дзяўчатамі...

— Я чула, што ў яго дрэнныя ацэнкі, — дадала Зося...

На банкеце з’явіўся яшчэ дзіўны мужчына. Хоць яму было за трыццаць гадоў, ён выглядаў як скейт. Мужчына лётаў па клубе з дарагімі фотаапаратамі і шчоўкаў усім па чарзе здымкі.

— Можа гэта шпіён з нашага ліцэя? — пажартавала Зося.

Пасля яна даведалася, што фатограф ходзіць па ўсіх моладзевых клубах і кавярнях ды здымае моладзь. Пасля ён публікуе свае „творы” ў інтэрнэце. Дзень пасля імпрэзы Зося ўвайшла на сайт фатографа... і ледзь не ўпала з крэсла!

Галоўным героем дня стаў... Яська! На адным здымку ён сядзеў з Зосяй і Адай. На іх століку стаяла можа 10 бакалаў піва. І каб таго было мала! Пад кожнай фоткай красаваліся з’едлівыя каментарыі. Пад здымкам Яські і дзяўчат фатограф напісаў: *За туманам нічога не відна!*

Зося паабяцала сабе, што ўжо ніколі не сядзе за піўны стол, нават калі за ім выседжваюць сябры з дзіцячага садка.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkorowu@tlen.pl

Вершы Віктара Шведа

Чаму маці маўчыць у хаце?
Запытаў свайго татку
Збянтэжаны Коля:
— Чаму нашая матка
Не спявае ніколі?

А ты ўпарта, хоць трэсні,
Паўтараеш у хаце:
— Тую ж самую песню
Спявае нам маці.

Неспадзяванка
Настаўніца пытае вучаніцу:
— Маеш ты брата
або сястрыцу?
— Здаецца хутка мець
буду брата,
Паведаміў аб гэтым тата.

— А што на гэтае матуля?
— Нічога ёй не прыгнулі.
Неспадзяванку зробім маме,
Нешта купім ёй у краме.

Музыка з кайфам

На хвалі — „J:MORS”

Мая прыгода з гуртом, які зараз даволі папулярны ў Беларусі, пачалася з 2003 года, калі з’явіўся дыск-трыб’ют „Viza N.R.M.”. Сама назва паказвае, каму ён прысвячаецца, але прыгадаю, што гэта альбом з песнямі гурту „N.R.M.” у выкананні іншых, менш ці больш вядомых выканаўцаў. Якраз адну з маіх любімых, больш сучасных энерэмаўскіх кампазіцый, „Катуйратуй” выканаў „J:MORS”.

„J:MORS” пачаўся з сяброўства яшчэ ў пачатках 1990-х гадоў, але вельмі хутка пераўтварылася яно ў сур’ёзную музычную дзейнасць. Уладзімір Пугач ды Арцём Лядоўскі вырашылі стаць сапраўднымі рокменамі. Не ад разу музыкаў ведалі як „J:MORS”, бо спачатку прыйшла ім у галаву самая простая назва і такім чынам з 1996 года на музычным рынку працавалі як „NO LOGO”. Музыкі ездзілі па Еўропе, вучыліся ды працавалі ў Нямеччыне, таму ў іх і замежныя ўплывы. Аказваецца, гэта паўплывала не толькі на назву, але ўвогуле на кшталт музыкі, бо як з самага пачатку, так і да сёння гэта адзін з лепшых гуртоў у жанры поп-рок. А адкуль новая назва? Магчыма сямейная літаратурнасць Рамана Арлова, сына выдатнага пісьменніка Уладзіміра, вырашыла пра змену такога кшталту, бо менавіта гітарыст Раман прапанаваў новую назву, пад якой гурт зараз вядомы публіцы. А кола прыхільнікаў немалое. З кожнага дыска гурту адна песня, а нават і больш, становяцца проста гітамі і круцяць іх па ўсіх радыёстанцыях. За гады працы запісалі шмат альбомаў, але ў большасці на рускай мове. Аднак сярод васьмі альбомаў знаходзім „Адлегласць” — першы беларускамоўны дыск, які пашырыў кола фанатаў гурту. Дагэтуль „J:MORS” не ангажаваўся ў беларускія падзеі, бо, паводле іх меркаванняў, усе яны надта палітызаваныя, таму і не ўзялі „Рок-кароны” з рук Аляксандра Мілінкевіча. Аднак час мяняе сітуацыю і зараз гурт спявае такама па-беларуску, а вакаліст, Уладзімір Пугач, разам з Лявонам Вольскім супольна запісалі песню ў стылі рэтра — патрыятычны сонг, нагадваючы творчасць „Бітлзаў”, пра рэкі і азёры Беларусі. Чакаем чарговых, аптымістычных праектаў!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 4

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 52:

Спех, каралі, сак, ар, гісторык, на, гімназія, іканне, столь, ясны, на. Паднос, плуг, ток, міг, сінь, рытм, онікс, арак, арак, рыза, Ас, Кінг, ла, Ян, ікра, Ева.

Узнагароды, **акварэльныя фарбы**, выйгралі **Агнешка Мароз, Анна Карчэўская** з Гайнаўкі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Эвеліна Артэмюк, Паўліна Раманюк** з Чыжоў. Віншуем!



ХТО КРАНАЕЦЦА ПЛЯЧЭЙ У БЯССОННЕ?..

Быў маладзік; і зноў, як заўсёды, быў маладзік.

За акном у маўклівае задуменнасці рассцілалася зорна-чорнае неба, а Ён не спаў з самага вечара.

Некалькі разоў падымаўся, каб папіць соку, прамыць цёплай вадою вочы, па-добраму ўсміхнуцца сабе ў люстэрка, ды зноў хаваўся пад коўдру. Сон усё роўна не ішоў. Цёплым, яскравым воскам плавіліся і сцякалі зоркі, за акном дыхаў кастрычнік задуменна-прыціхлаю вільгаццю, толькі чамусьці душа не хацела сустракацца са спакоем; і ціха-ціха звінела на тумбачцы росная шклянка з вадою.

Тады Ён успомніў добры, праверaны спосаб: няспешна пачаў лічыць кудлатых, бадлівых баранчыкаў. Бясконцы, нямераны статак рагаценькіх бекекешаў прайшоў перад ім, аднак сонная змора не наступала і блізка. Тады за баранчыкамі пайшлі трусікі, быкі і чамусьці легкавікі, потым паляцелі гракі і вароны, і нарэшце сталі апускацца на зямлю ды ўздымацца ў вышыні — маленькія, радасныя анёлкі.

— Дзюру ў нагавіцах знарок прапаліў? Не хвалюйся, і без таго было бачна..., — пачулася раптам побач, зусім блізка, амаль над вухам.

— Твае мятныя пігулкі, што пад падушкай, — сродак райскага натаўлення?

— Не можаш заснуць? І правільна: як можна спаць без мяне?!

— Выкінь прэч свой гадзіннік! Які к чорту час, калі я — побач?!. — І далей раптам ціха, амаль нячутна: — Паглядзі: нават зоркі шыпяць і сыкаюць ад зайздрасці і шкадобы, што не могуць вось так, дакрануцца...

І Ён адчуў на сваім плячы дотык. Дотык — магчыма, вуснаў, што пахнуць малочным адчаем дагарэлага лета; магчыма, рук, што нарастаючай электрычнасцю прымушаюць забыць нават сваё імя; магчыма, веек, што валошкавым казытаннем пакідаюць на скуры лёгкія, недаравальна-мядовыя апёкі.

— Заставайся са мной..., — яшчэ здолеў ціха выдыхнуць Ён. І праваліўся, прапаў, зліўся з самым салодкім, самым мройным і асвяжаючым сном у тую ноч.

А на раніцу — знайшоў на сваёй падушцы толькі лёгкае, белае пёрка.

— Што скажаш? — спытаў, калі прыйшоў у лабараторыю да свайго сябра, які займаўся выключна анёлалогіяй.

— Давай праверым... — з асцярожнай глыбакадумнасцю ўзяўся за пёрка той. І прамовіў, калі скончыў аналіз: — Прабач, але ў банку дадзеных усіх вядомых для нас анёлаў — ніякіх звестак па гэтаму пёрку не знойдзена.

— Тады як думаеш, чыім яно можа быць?

Нічога не сказаў болей сябар, неяк уважліва і сур'ёзна паглядзеў на Яго.

Непрабудна і моцна спаў Ён наступнае ночы і ва ўсе, што надараліся потым. Ніхто болей не прыходзіў да Яго.

Толькі рука пад падушкаю моцна сціскала ўжо не белае пёрка, а чорную пасмачку, і пахла яна — зусім не мёдам, не малаком і не мятаю...

Ігар СІДАРУК
Кобрын

„Мы стрэнемся, хоць нас ужо не будзе...”

Да нас дзяцел прыляцеў,
Пані Ніна...
Быццам грушачкі паеў,
Пані Ніна...
Прыляталі „снегіры”,
З дзіўным чубам...
Падымаюць каўняры
Дзіўна людзі...
Божа, Божанька... зіма...
Пані Ніна...
Вас няма...

Света Варонік

27 студзеня — 40 дзён, як няма з намі Ніны Мацяш.

Мая сям'я мела вялікі гонар сябраваць з Нінай, час ад часу ліставацца з ёю, а напярэдадні свайго 65-годдзя я атрымала ад яе цудоўны падарунак — дзве карцінкі з выявай пяшчотных букецікаў, зробленых з пёрак зязюлі і дзікага голуба, знойдзеных у лесе.

Такімі карцінкамі ўпрыгожаны сцены яе ўтульнай кватэры ў Белаазёрску. Гэтыя цуды, створаныя яе ўмелымі рукамі, Ніна дарыла блізкім людзям. Цешыць мяне, што мела магчымасць час ад часу сустракацца з ёю. Дзве апошнія сустрэчы ў снежні мінулага года асабліва памятныя.

Стаяў па-вясноваму сонечны зімовы дзень. Настрой быў адпаведны — узнёслы і святочны. Юнак, якога мы не змаглі пакінуць на ўзбочыне шашы з узнятай рукой, паказаў не толькі вуліцу, але і дом, і нават пад'езд, у якім жыла Ніна. Адразу падумалася, што яе тут паважаюць і добра ведаюць.

Ніна чакала нас і адразу распарадзілася, каб яе памочніца Ала накрыла стол.

Пакуль Наталля гутарыла з Нінай, я агледзела ўсе пакоі. Тут было так утульна, усюды чытаўся адмысловы густ гаспадыні, мноства кветак і кніг. З удзячнасцю падумалася пра людзей, якія стварылі ўсе ўмовы, каб яна магла самастойна выехаць на прагулку. З гэтай мэтай была зроблена прыбудова да бакавога пакойчыка — пандус з парэнчамі, што вядзе навонкі.

Праз тыдзень мы наведаліся ў Белаазёрск ізноў. З намі былі мае ўнучкі, якім вельмі хацелася пазнаёміцца з аўтаркай любімых вершаў і казак. Ды і калі яшчэ надарыцца такая нагода?

Пачастункі паклалі ў халадзільнік, папярэдзіўшы, што абыдземся сёння без застолля. Ананас гаспадыня прапанавала вынесці на лоджыю: „...будзе на Новы год замест елкі”. Не збылося...

Узяўшы інтэрв'ю, Наталля прапанавала Ніне сфатаграфавацца разам. Пасля рабіла „фотасесію”, з дапамогай лёгкага шаліка мяняючы выгляд гаспадыні (Ніна хацела новы здымак у новы зборнік, які дачакаўся сваёй чаргі ў выдавецтве).

Паехалі з намерам і далей сустракацца, як пры нагодзе, так і з патрэбы душы.

Ранішні званок Косці Жмінько насцярожыў. Мой даўнішні студэнцкі сябар, а сёння паэт і вольны мастак, заўсёды вітае мяне са святамі. 19 снежня — Мікола зімовы, але голас яго быў не па-святочнаму сцішаны і трывожны. Задаўшы пару „дзяжурных” пытанняў, са слязой дадаў: „Няма нашай Ніны”.

Ішлі і ішлі бясконцай чарадой людзі, каб развітацца з ёй, праводзіць у апошні шлях. Неслі кветкі, многа кветак і вянкоў.

На лёс ці варта наракаць?
Жыццём нягоды не адужаць.
Жыццё заўжды
— іспыт на мужнасць,
Яе ж не возьмеш напракат.

Гэтае жыццёвае крэда Ніны Мацяш заўсёды падбадзёрвала тых, хто быў гатовы скарыцца перад выпрабаваннямі лёсу, натхняла пачаткоўцаў на няпросты іспыт жыцця, давала сілы ісці наперад:

Ямчэй прымошчваю
На плячах насмылелых
Свой крыж:
Рушайма далей, дарагія.

Годна несла Ніна свой жыццёвы крыж, сваю паўсядзённую ношу да апошняга дыхання. Сэрца яе спынілася ў сне, у ноч з 18 на 19 снежня. У народзе кажуць, што такую лёгкую смерць у Госпада трэба заслужыць.

Яна заслужыла...

Я ж не ару, не сею і не жну я,
І не праду, не тку і не будую —
Выводжу толькі думкі на папас,
Над словам праўды зболенай шчырую.

Сярод кніг, напісаных Нінай, ёсць адна сціплая і вельмі асабістая „Я вас люблю...” — вершы-прысвячэнні родным, знаёмым, блізкім па духу людзям. Гэта ўдзячнасць паэтэсы ўрачам, сябрам і ўсім неабыякавым да яе лёсу.

Сябры, мне добра з вамі, —
Заўсёды добра з вамі!
Пагэтаму і чарку
Я падніму за вас: —
Хай мы заўсёды будзем
Багатыя сябрамі
І вераю нятхнёнай
У сэрцаў зорны час!

Яна была добрай сяброўкай: неабыякавай, узрушанай, кампанейскай, вясёлай...

Будзем адхукваць зынелую рунь,
Колькі магіі ёсць, ёсць сілы,
Дзеля ўмалоту і шляху ў зару
Вольнасці, а не ў магілу!

Будзем!

Тамара ЛАЎРАНЧУК, Высокае

Пакінуў нас Земавіт Фэдэцкі

Увосень 2001 года ў Беларускі клуб, які тады знаходзіўся ўжо па вуліцы Старасцінскай у Варшаве, прыйшоў аднойчы незнаёмы мне чалавек і ад парога ўжо загаманіў па-беларуску, на прыгожай чысценькай літаратурнай мове.

— Вітаю Вас, сядайце, — запрашаю я. — Ці Вы з Беларусі?

— Не, хаця бываў і там. Мяне туды і цяпер цягне. Я нарадзіўся на Беларусі. Я — Земавіт Фэдэцкі, паляк. Але ў ранняй маладосці і ў цяжкія гады нямецкай акупацыі жыў у беларускай вёсцы Феліксаве, у сям'і майго сябра Уладзіміра Мальца. Працаваў з імі ў полі і пры іншых занятках, слухаў іхнюю мову, вучыўся. Запісаў колькі змог цудоўных беларускіх песень. Яны ў рукапісе. Хацеў бы, каб Беларускае таварыства ў Варшаве дапамагло мне перапісаць гэтыя песні на беларускай машынцы, скласці ў кнігу і выдрукаваць.

Вось як пачалося наша знаёмства з Земавітам Фэдэцкім. Варшаўскі аддзел БГКТ узяўся за гэтую справу і ўжо ў канцы 2002 года „Цёплыя вечары і халодныя ранкі” выйшлі з друку і пачалі разыходзіцца сярод беларусаў і не толькі. Частка з іх трапіла ў вёску Феліксава (завёз іх сам Земавіт Фэдэцкі) і ў іншыя мясціны Беларусі.

Нарадзіўся Земавіт Фэдэцкі 22 жніўня 1923 г. у Лебядзе Лідскага павета. Па адукацыі ён славіст. Перакладаў з беларускай, рускай і французскай моў. У час акупацыі памагаў маці, Марыі Фэдэцкай, ратаваць яўрэяў, за што яна пасмяротна ўзнагароджана медалём „Справядлівы між народаў свету”. Пасля вайны, працуючы прэсавым аташэ ў Маскве, падтрымліваў фінансава Барыса Пастэрнака, калі той не меў сродкаў каб пражыць. У Польшчы дамагаў Канстанты Ільдэфансу Галчынскаму. Прыслужыўся культурнаму збліжэнню Польшчы з Расіяй, перакладаючы на польскую мову творы м.інш. Аляксандра Купрына, Юрыя Тынянава, Міхаіла Булгакава, Юрыя Трыфанава, Мікалая Забалоцкага, Сяргея Ясеніна, Уладзіміра Высоцкага, Ісаака Бабеля, Марыны Цвятаевай, адкрыў Булата Акуджаву. У 2001 г. атрымаў узнагароду ПЕН-клуба за пераклады з беларускай, рускай і французскай моў....



— „Ці звонка жонка? Ці дзеці гудуць?” — пытаў у нашай ваколіцы сусед суседа і не здагадваўся нават, што гэтым пытаннем перакладвае прозу штодзённага жыцця на музыку, — пісаў Земавіт Фэдэцкі ў прадмове да „Ціхіх вечароў...”. — Калі ў хаце згук ды зык, калі сыздалі чуць як усё там пяе — значыцца, справы ідуць на добры лад. (...) Не толькі жывыя творы гаварылі на нашай каханай Беларусі. Стыхіі таксама. Беларуская вада часам смяецца, часам плача, нешта шапеча, а часам маўчыць. (...) Беларусы людзі добрыя. Не шкадавалі песняў Міцкевічу, і табе не пашкадуюць. Такім спосабам беларуская „ціхая вада” трапіла ў паэму Галчынскага „Ніобэ”. Як не кінь, спеў і мова не жывуць на Беларусі паасобна. (...) Гэтая кніга — для людзей і для мяне самога. Я хачу верыць, што чорнае трупяхлё здзеку перастане ўрэшце нішчыць жывое цела беларускае мовы і што новае пакаленне зачне больш чым раней цікавіцца песнямі свае бацькаўшчыны. (...) Я сам буду заглядваць у свой зборнік, услухоўвацца ў словы і ноты, каб яшчэ раз убачыць Беларусь, каторую я пакахаў з маленства, гэтую цудоўную старонку, сумную і вясёлую, што ззяе, грае і пяе быццам яе нехта гукамі апырскаў”.

Земавіт Фэдэцкі памёр 8 студзеня 2009 года ў Варшаве.

Алена АНІШЭЎСКАЯ, Варшава

Час на „Беларускія чацвяргі”

Я доўга думала, які фрагмент даклада доктар Ірэны Матус паставіць у пачатку. Усё, што сказала дакладчыца ў жывым, насычаным прыкладамі з беластоцкай глыбінкі выступленні, вартае пачатку. Мне дапамог *стары* час. Гэты артыкул пішу ў час *вадзяной* (*галоднай*) Каляды. Пакуль не асвецяць вады, абавязвае строгі пост. (Паколькі ў гэтым годзе каляда выпала ў нядзелю, пост адпускаецца. У многіх цэрквах ваду пасвяцілі ўжо пасля ютрані). Асвечаная вада на Вадохрышча выконвала асаблівую ролю.

У час лекцыі Ірэны Матус

Гаспадар зрэзваў верх каляднай кветкі-госця, мачыў яе ў асвечаную ваду і крапіў хату ды гаспадарчыя будынкі. Паколькі завяршаўся калядны цыкл святаў, ён „запісваў” святы: браў у рукі крэйду і ставіў знак крыжа над уваходнымі дзвярыма ў дом або ў хлявы, дзе стаяла жывёла. Пасля гэтай задачы цэлая сям’я садзілася за калядны посны стол. Цэнтральнае месца займала страва-куцця. Нашы продкі адзначалі тры Каляды — дзве посныя: перад Божым Нараджэннем і Вадохрышчам ды „мясную” ў Шчодры вечар.

Свой даклад пра калядна-карнавальныя абрады доктар Ірэна Матус, зразумела, пачала ад свята Каляд.

Святкаванні маюць дахрысціянскі пачатак, яны звязаны з культам Сонца. Каляда ва ўяўленні нашых продкаў явілася як багіня неба, якая прыязджае на залатым кані. Яна нараджала сына, які меў перамагчы Мару — багіню смерці. Па сённяшні дзень у калядных абрадах Падляшша захаваўся матрыярхальны характар культу. Калядоўшчыкі ў сваіх пажадальных калядках славяць гаспадыню ў вобразе Сонца, (гаспадаром выступае Месяц, дзеці — гэта зоркі)...

Шматлюдная аўдыторыя (урэшце з’явіліся студэнты) і не прыкмеціла, калі мінула акадэмічная гадзіна даклада. Доктар Матус распавяла яшчэ пра Грамніцы, карнавальны абрад „Вяселле Цярэшкі”. На просьбу слухачоў прыблізіла дахрысціянскія абрады — Камаедзіцу (у гонар мядзведзя) і Лялечнік (на сустрэчу вясны). Сустрэча адбылася ў рамках „Беларускіх чацвяргоў”, 15 студзеня г.г. у будыку Універсітэта ў Беластоку. Той, хто патрапіў на „Беларускі чацвер”, не будзе сумнявацца ў патрэбе купіць новую кніжку д-р Ірэны Матус, прысвечаную абраднасці жыхароў Падляшша.

Паколькі паводле старога стылю ў Беластоку адзначалі другі дзень Новага года, яшчэ ў пачатку сустрэчы д-р Лена Глагоўская выказала навагоднія віншаванні. Адзначыла, што жыццё паводле новага і старога календароў мае свае плюсы. Яе знаёмыя каментуюць гэтую асаблівасць з пэўнай зайздрасцю. Яны лічаць, што ў нас іншае пачуццё часу, словам, на ўсё маем час. Калі не паспеем зрабіць нешта да 31 студзеня, не кідаемся ў адчай — на завяршэнне справы ёсць яшчэ 13 дзён!

* * *

Усё больш жыхароў Беластока мае час для сустрэч у „Беларускія чацвяргі”. Я сама не магла дачакацца сустрэчы з прафесар Ліляй Цітко, якая адбылася 11 снежня 2008 года. Рэдка калі ёсць нагода сустрэцца з даследчыкам старажытнабеларускай літаратуры. Заслугі прафесар Лілі Цітко ў гэтай галіне асаблівыя. Яна спецыялістка па „Хроніцы Быхаўца”. Як вядома, кірылічны арыгінал літаратурнага помніка XVI стагоддзя не захаваўся. Прафесар Цітко, з улікам старажытнабеларускай граматыкі, сама паспрабавала зрабіць кірылічную рэканструкцыю твора. Тэкст надрукаваны побач лацінскага варыянта ў кніжцы пад красамоўным загалоўкам „Kronika Bychowca na tle historii i geografii języka białoruskiego”. Кожны, хто рыхтаваўся да алімпіяды па беларускай мове або вывучаў беларускую літаратуру ва ўніверсітэце, „Хроніку Быхаўца” запамятаў хоць бы — па адной прычыне. Аўтар хронікі прадставіў сваю версію славутай бітвы пад Грунвальдам. Паводле беларускіх крыніц, перамогі над крыжаносцамі дабіўся мужны князь Вітаўт. Ягайла адно назіраў за полем бітвы з бяспечнай дыстанцыі, схаваўшыся ў лесе...

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

СЭРЦАМ АДДАНЫЯ МОВЕ

Гэта было даўно, з пяць стагоддзяў таму, калі зацны сын беларускага народа „доктар Францыск Скарынін сын з слаўнага гораду Полацка” , бліскучы перакладчык, гуманіст і друкар першым ва Усходняй Еўропе здзейсніў вычын, пераклаўшы з латыні на беларускую мову галоўную па тым часе кнігу — „Біблію”. Больш за тое, ён аздобіў яе ўласнымі адмысловымі тлумачэннямі і вобразнымі малюнкамі. Ён надрукаваў яе, і гэта сімвалічна, што нашай першай друкаванай кнігай сталася менавіта „Біблія”.

Але ж не толькі шмат таленту, гэтулькі ж смеласці і гераізму вымагае наватарства. Заўсёды цярністы шлях у першапраходца, бо знойдуцца тыя, каго змены да лепшага ніяк не абрадуюць. Айчыннае духавенства не зразумела Скарыну. Ён нёс прагрэс і духоўнасць — яго вінавацілі ў ерасі і блюзнерстве. А ў суседняй сталіцы Маскве яго ледзь не забілі; яго кнігі спалілі.

Аднак не прапалі намарна стараннi асветніка. Люд паспаліты па-новаму зірнуў на мову беларускую, бо праз мову ім стала зразумелым Слова Божае, і палюбілі яны слова сваё так моцна, як Бога. І пакляліся тады беларусы, што на векі вякоў берагчы-шанаваць сваю мову будуць, як праменьчык святла,што, прайшоўшы праз кожнае сэрца, злучыць нас з Богам, зрабіўшы нас роўнымі сярод роўных, паважанымі ў свеце праз самабытнасць. Трыумфальнымі салютамі прагрымелі над Еўропай Статуты, пра якія канцлер Леў Сапега з гонарам сказаў: „не обчым яким языком, але своим власным права писаныя маем”. На той час мы былі адной з самых вялікіх і магутных дзяржаў у свеце.

Усведамляючы еднасць лёсаў мовы і народа, беларусы вырашылі зрабіць сваю Мову самай рэспектабельнай, панскай. А вось у якасці рабочай мовы прыцягнуць да працы польскую альбо рускую. Так усё менш ужывалася мова нашая ў справаводстве, але моцна стала патрэбнай для сувеніраў.

Роднай беларускай мове складаліся дыфірамбы, спяваліся оды. Спрадвеку не было ў нашым краі паэта, хто б не стаў на калена прад Яе Вялікасцю Мовай, не ўспеў бы яе мілагучнасць і непаўторнасць, яе грацыёзнасць. Бо хто не ўспеў — дык той не наш паэт!

Сваю Мову беларусы глыбока хаваюць у сэрцы. Пры нараджэнні дзіцяці над Беларуссю загараецца знічка. Слізгануўшы па небе, нібы прывітальна ўсміхнуўшыся, яна запаляе душу беларускага немаўляці. У адказ немаўля адгукнецца — пачуйце, на Мове! — і пранясе Мову ў сэрцы, дакуль яно будзе біцца.

Так было
Так ёсць
І так будзе?..

Алесь Яжэвіч
28.10.08.

Тамаш Ліпаман

Пазначаны дзік

Дня 27 верасня Лета Божага 1752, кароль Польшчы Аўгуст III Сас арганізаваў у Белавежскай пушчы вялікае паляванне. І дагэтуль, у Палацавым парку ў Белавежы, паміж сажалкамі стаіць абеліск з пясчаніку, усталяваны ў памяць аб тым паляванні.

Паляванне, тое, зрэшты, па сённяшніх мерках хутчэй трэба было б назваць разнёй.

Былі забіты 42 зубры, 13 ласёў, дзве казулі, не лічачы дзікоў. Так пазначана на мемарыяльным абеліску. Спецыяльна прывезеныя каралеўскія егеры пры дапамозе аблавы, у якой удзельнічала каля тысячы чалавек, месяцамі заганялі звера на адмыслова прыгатаваныя ў лесе загоны, якія па сённяшні дзень завуцца Аўгустоўскім Садам.

Шмат звера загінула падчас загонкі ў пастку, яшчэ больш — месяцамі чакаючы прыбыцця яго каралеўскай мосці. Сас разам з жонкай — Марыяй Юзэфай, якая па словах сучаснікаў была брыдкая як „грэх смяротны”, уладкаваліся ў адмысловай альтанцы, пад якой праз вузкі праход праганялася дзічына.

Яе мосць сама забіла палову з 42 зуброў і шмат іншых жывёлінаў, у перапынках слухаючы французскія рамансы.

Аб адным з дзікоў, на спіне якога віднеўся выразны чорны крыж, я збіраюся Вам распавесці.

Аўгуст Сас, прывыклы паляваць на захад ад Эльбы, першы раз сустрэўся з такім асабліва памечаным дзікам. Калі егеры патлумачылі яму, што і для Белавежы такі звер з’яўляецца асаблівым, кароль пачаў распытваць мясцовых і ў выніку пачуў ад аднаго з загоншчыкаў — Леха Байко — такое вось апавяданне.

Калісьці даўно, па запрашэнні Конрада Мазавецкага, прыбыў у Польшчу Тэўтонскі ордэн. Рыцары Марыі павінны былі абараняць ад прусаў паўночныя рубяжы Мазовіі, а пасля навяртаць у хрысціянства плямёны балтаў. На практыцы, аднак, яны займаліся рабаўнічымі паходамі, пашыралі тэрор і папаўнялі ўласныя багацці.

Падчас аднаго з такіх паходаў чатыры рыцары ў белых плашчах з чорнымі крыжамі патрапілі ў Белавежскую пушчу. У той час быў гэта бязлюдны край. У малаколькасных хутарах можна было, аднак, сустрэць апошніх яцьвягаў і некалькі мазаўшан, якія замест земляробства аддалі перавагу паляванню і пчалярству.

Рыцары ордэну, наталіўшыся мясцовымі кабетамі, аленінай, калачамі і моцнымі мядамі вырашылі зрабіць што-небудзь для збаўлення мясцовага насельніцтва. Нагода прадставілася сама па сабе.

Ад аднаго са злоўленых „языкоў”, які зрэшты сканаў, бо быў прабіты мячом (што было для крыжакоў, як сёння мы б сказалі, стандартнымі паводзінамі) рыцары даведаліся, што на рацэ Лутоўні жыве самотная старая знахарка — Ксантыпа.

Старая вяла пустэльны вобраз жыцця, служыла ранейшым багам, збірала травы, апрацоўвала дары пушчы і калі было трэба займалася варажбой, лячэннем ран, замаўляннем хваробаў, адным словам, выконвала функцыі мясцовага лекара.

Крыжакі рушылі да аддаленага ўрочышча поўныя імпэту, якога не збілі нават знакі, што яны сустрэлі па дарозе.

Ні мёртвая сойка, што ляжала папярок лясной просекі, ні крык кукакаўкі ў самы поўдзень, ні нават від святога вужа ў залатой кароне не астудзілі іх запалу.

Крыжакі прыбылі на Лутоўню на захадзе, перад магічнай ноччу Купалы, падчас якой згодна адвечным славянскім вераваннням чараўніцтва мае асаблівую моц. Прыбылі яны з аголенымі мячамі, каб адразу адправіць Ксантыпу наўпрост у гаспадарства Перуна.

Жанчына, аднак, хоць і была ў веку, ды не была пазбаўленая асцярожнасці, патрэбнай каб выжыць у лясным гушчары, поўным дзікага звера. Перш чым халоднае лязо кранулася яе грудзей, яна вымавіла адпаведныя заклінанні і ператварыла рыцараў у чатырох дзікоў, якія на памяць аб гэтай падзеі былі азначаныя чорнымі крыжамі.

Старэйшыя людзі ў Белавежы не памятаюць, калі за апошні час удавалася забіць дзіка з крыжам на спіне. У гміне аднак гавораць, што яшчэ прынамсі адзін такі звер ходзіць у белавежскім нерушы. Яго бачылі некалькі год таму паблізу Месца Моцы ў квартале 495.

Гавораць таксама, што калі ён будзе забіты, вернуцца ранейшыя багі на чале з Лесавідам. Колькі ў гэтым праўды, цяжка казаць, але праўда тое, што два гады таму ў паселішчы Грушкі, насупраць надлясніцтва Броўск, з’явілася драўляная статуя Лесавіда.

пераклад Міры Лукшы

Анталогія і постмадэрнізм

Ад нейкага часу дзесьці ў Польшчы (не ўлічваючы Беластока) выдаюцца кнігі аўтараў з Беларусі. Першынство ў гэтым трымаюць Вроцлаў і Беларуская выдавецкая праграма *Kolegium Europy Wschodniej* імя Яна Новака-Езяранскага. Здаецца, у апошні час у гэтай справе з Вроцлавам стала сапернічаць Варшава.

Прытым тую — як мне здаецца — нішавую ў Польшчы літаратуру распаўсюджваюць галоўным чынам невялікія выдавецтвы. Якраз у такіх паказаліся нядаўна дзве кнігі. Першую: *Adam Kłakocki i jego cienie* прызнанага ўжо аўтара Ігара Бабкова выдала варшаўская „Oficyna21". У сваю чаргу Бібліятэка квартальніка „Tekstualia" пры варшаўскім Доме культуры „Сьрудмесьце" — *Suplement poetycki ze współczesnej liryki białoruskiej*, які з'яўляецца быць дадаткам да паралельна выдадзенай Калегіумам Усходняй Еўропы анталогіяй беларускай паэзіі (ад XV да XX стагоддзя): *Nie chyliłem karku przed mocą*. Сярод гурманаў літаратуры гітам стаў *Адам Клакоцкі*... Рэцэнзенты сцвярджаюць: „Гэты раман лічыцца першым постмадэрнісцкім раманам і адным з найважных літаратурных твораў апошняга дзесяцігоддзя. Параўноўваецца ён да твораў Борхеса, Павіча, Картазара", „Гэта цікавае спалучэнне дзевятнаццацівечных аповедаў з сучасным аповедам пра Мінск — горад, які ў Бабкова з'яўляецца сімвалам распаду і гонару адначасова. Бачым гідлівасць беларускай экзістэнцыі. Назіраем за людзьмі такімі шэрымі, як польская рэчаіснасць васьмідзесятых. Аднак пад гэтай паверхняй скрываецца краса культуры і літаратуры". Сам Ігар Бабкоў у падзагалоўку піша: „раман у дзесяці гісторыях з жыцця адважнага асветніка і энцыклапедыста Яна Адама Марыі Клакоцкага з дадаткам зацемаў аўтара, двух эпіграфаў з лістоў сусветнавядомых творцаў (...), а таксама фрагментаў двух ненапісаных раманаў, якія — з глыбокай метафізічнай перспектывы — бачацца як адзін ненапісаны раман пад рознымі назвамі". Варта спаслацца на гэты загаловак, паколькі перад тым як узяцца за ўважлівае чытанне гэтай кніжкі, трэба было б найперш з увагай прыгледзецца гэтай у больш за 140 старонак канструкцыі з перамешанымі ў самы розны спосаб тыпамі апавядання. Асцярожна трэба, аднак, падыходзіць да герояў, бо не заўжды аўтар ясна паказвае, хто з іх з'яўляецца творам літаратурнай фікцыі, асабліва таму, што стыкуюцца яны з постацямі з рэальнай гісторыі, гэтай даўнейшай і найнавейшай. Дарэчы, няцяжка даць звесціся аўтару ўжо на пачатку рамана, значыць, „Матэрыялам з жыццяпісу Адама Клакоцкага" і паверыць, што той, народжаны 6 верасня 1793 г. (год другога падзелу Рэчы Паспалітай) у маёнтку Сапуны паблізу Навагрудка ў сям'і дробнага шляхціча, навуковец-даследчык сноў гэта рэальная постаць. Фактычна той нейкі Клакоцкі не існаваў, хоць не паказваюць на тое прыведзеныя спасылкі, скажам, на Язэпа Янушкевіча, адкрывальніка забытых слядоў пакінутых вялікімі беларусамі (між іншым, Вінцука Дуніна-Марцінкевіча). Ігар Бабкоў на тыльнай вокладцы кнігі напісаў: „Вы ўваходзіце ў філасафічны трактат, калі вы ні ў чым непераканаеныя і няўпэўненыя. Вы ўваходзіце ў практычны дапаможнік па кітайскай народнай гульні ў інь і ян, калі адчуваеце, што няма каму быць у чымсьці пераканаеным альбо ўпэўненым".



Затое *Suplement poetycki ze współczesnej liryki białoruskiej* гэта паэзія больш за трыццаці аўтараў, выбраная Адамам Паморскім у — як заўжды майстэрскіх — перакладах ягоных і іншага маэстра транслярскага мастацтва — Ежы Літвінюка. Як кажа Адам Паморскі ва ўступным слове, гэта суплемент не толькі да вроцлаўскай анталогіі і выдадзенай КУС ранейшай анталогіі маладых паэтаў *Pępek nieba*, але таксама „суплемент да нашых ведаў (або няведаў) аб гэтай культуры. У сабраных тут вершах некалькіх пакаленняў беларускіх паэтаў, незалежна ад лагоднасці ці гвалтоўнасці тону, выбіваецца найперш лірызм, пасля зменлівая ў часе разнастайнасць. Ударае таксама паэтычны клас: непатрэбны тут ільготны тарыф, хопіць уражлівасць вуха і смаку". У гэтым томіку, апрача беларускіх паэтаў з украінскім ці хутчэй палескім радаводам, можна знайсці вершы прызнаных лірыкаў Беларусі, м.інш. Юркі Голуба, Алеся Разанава, Уладзімера Арлова, Алеся Чобата, Анатоля Сыса, Андрэя Хадановіча ці хоць бы стваральніка *Адама Клакоцкага*. Ёсць лірыкі аўтараў наймаладзейшага пакалення, як мінчаніна Анатоля Івашчанкі (год нар.: 1981; дэбют: 2006 г. у элітным часопіце „Дзеяслоў"). Што можа крыху здзіўляць, найбольш месца ў гэтай анталогіі толькі ў 140 старонак Адам Паморскі знайшоў да вершаў бяльшчанкі Надзеі Артымовіч. Ну, што ж, літаратура беларуская адна: пісаная па-беларуску, незалежна ад тапаграфіі месца аўтараў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беларусь сёння незалежная. Гэтае вызначэнне, нібыта, не патрабуе ніякіх доказаў — існуе беларуская валюта, беларускія прадстаўніцтвы ў розных краінах свету. Улада, якая цэлы час распавядала нам пра нейкую там інтэграцыю з усходнім суседам, сёння адчула ўсе вартасці незалежнага гаспадарання на гэтым кавалку планеты. Усё на першы погляд добра, нават калі заплюшчыць вочы на адсутнасць дэмакратыі і грэблівае стаўленне да правоў чалавека ў сучаснай беларускай дзяржаве, але бракуе тут вельмі важнага чынніка — нацыянальнай самасвядомасці як мясцовага люду, так і мясцовай улады. А з таго — ёсць Рэспубліка Беларусь на даны момант нейкім ашчэпкам Савецкага Саюза, дзе аб папулярызацыі нацыянальнай годнасці няма і мовы. Таму, пры пэўных акалічнасцях, згубіць Беларусь сваю дзяржаўную незалежнасць роўна з такой жа лёгкасцю як і набыла.

На жаль, нацыянальная кансерватыўная ідэя не мае шырокага ўплыву на свядомасць людзей, што называюць сябе беларусамі. Каб нейкім чынам змяніць гэтую сітуацыю, ад'ядноўваюцца неабыякавыя людзі ў рознага кшталту арганізацыі кансерватыўнай накіраванасці, маючы надзею, што нацыянальныя каштоўнасці, у рэшце рэшт, зоймуць належнае месца ў грамадскім жыцці Беларусі. Адной з праяў такога жадання з'яўляецца аргкамітэт па стварэнню „Правага альянсу" — арганізацыі, якая ставіць перад сабой за мэту „прапаганду нацыянальнай ідэі сярод грамадства".

Каб пазнаёміцца з „Правым альянсам", не лішне будзе завітаць на ягоны сайт у інтэрнэце, што месціцца па адрасе **http://aljans.org**.

Сайт выглядае даволі неардынарна. У ім зменена традыцыйная будова — няма трох частак, а ўсе выйсці да рубрык месцяцца толькі ўверсе выяўлення. Змест жа інтэрнэт-бачыны сканцэнтраваны ў дэвізе „Душу — Богу, жыццё — Беларусі, годнасць для сябе!".

Першае, што кідаецца ў вочы пры агляданні выяўлення, гэта тое, што галоўны націск у ім распрацоўшчыкі робяць менавіта на навіны. З іх пачынаецца першая, і заадно галоўная, старонка сайта, і яны ж падаюцца асобнай падрубрыкай на старонцы „Тэмы".

Другая найважнейшая рубрыка — „Ідэалёгія". Адсюль мы можам даведацца, чым „дыша" „Правы альянс", на чым стаіць і да чаго імкнецца. Цікава, што пачынаюць расповед „праваальянсаўцы" са свайго пункту гледжання на фінансава-эканамічны крызіс, якім жыве сёння зямны шар. „Бліжэйшыя часы Беларусі — гэта часы зьменаў. Па старому саўкова — „стабільнаму" жыць ужо папросту немагчыма. Улада спрабуе „сеўшы на шпагат" скарыстоўваць як усходні, так і заходні вектар, каб неяк паляпшыць сацыяльна-эканамічную сітуацыю", — кажуць беларускія правыя і прапануюць свой шлях да лепшай будучыні. „Каб народ адчуў сваё нацыянальнае адзінства, патрэбна лучнасьць і салідарнасьць па розных кірунках, якія бы зьнітоўвалі нацыянальны арганізм у адзінае цэлае", — пішуць „праваальянсаўцы", пераконваючы нас, што „цяпер надыходзіць час не проста пратэстнай апазіцыі — а стваральнай, сутнасна беларускай, сумленнай і дзейснай альтэрнатывы. Такой, якая б будавала ў сэрцы Еўропы новую краіну".

Што ж тычыцца „Правага альянса" як арганізацыі, то інфармацыя аб ім месціцца ў аднайменнай рубрыцы, дзе змешчаны яго статут.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Новае азарэнне

У студзені ў эпіцэнтры міжнародных спаборніцтваў зазвычай два віды спорту — вялікі тэніс і біятлон. Шэраг прадстаўнічых турніраў на кортах праходзіць у гэтым месяцы на аўстралійскім кантыненце. Прэлюдыяй да першага спабору з серыі так званага Вялікага шлема — Australian Open — стаў турнір ў Брысбене. З вялікай прыемнасцю канстатуем, што ўпершыню ў сваёй кар'еры вышэйшы прыз з серыі Сусветнай тэніснай асацыяцыі ў адзіночным жаночым разрадзе ўзяла беларуска Вікторыя Азаранка. Апошні раз на рахунак беларускіх тэнісістак такі поспех выпадаў дзесяць гадоў таму — у ліпені 1999 года перамогу святкавала Наталля Зверава. Азаранка нарэшце пераадолела комплекс фінала і з пятай спробы выйграла вырашальны матч. Да гэтага чатыры яе выхады ў фінал завяршаліся толькі другім месцам. На гэты раз у Брысбене Вікторыя цалкам адпавядала свайму імені і ў вырашальным паядынку проста не пакінула шанцаў Марыён Барталі з Францыі — 6:3 і 6:1. Прызавыя беларускі склалі 220 тысяч долараў. Але не гэта галоўнае — важна, што Азаранка на кароткі час узначаліла чэмпіёнскую гонку сезона, а ў сусветным рэйтынгу ўзнялася ўжо на 14-ю пазіцыю. Патрошку падымаюцца і іншыя беларускія тэнісісткі. Вольга Гаварцова зараз 45-я ракетка свету, да соткі блізкая Анастасія Якімава (101-ы радок), у ліку двухсот лепшых таксама Кацярына Дзегалевіч і Тацяна Пучак. А вось у беларускіх тэнісістаў справы тут сумныя. Закончыў выступы Уладзімір Ваўчкоў, Максім Мірны перастаў выступаць у адзіночным разрадзе і засяродзіўся толькі на парным. А першай ракеткай Беларусі цяпер з'яўляецца малады Уладзімір Ігнацік, які ў сусветным рэйтынгу толькі 432-і. На Australian Open выступяць, зразумела, толькі беларускія дзяўчаты. Ці спасцігне новае азарэнне Азаранку, ад якой цяпер можна чакаць многага?

Лакальны поспех выпаў на долю біятланісткі Дар'і Дамрачовай. На этапах Кубка свету ў нямецкіх Оберхофе і Рупольдынгу ёй давялося перажыць цэлую гаму пачуццяў. Спярша ў так званым масавым старце з лідаркай нашай дружыны здарыўся неверагодны казус. Ідучы ў шэрагу першых на другім стралковым этапе, яна замест практыкавання лежачы, выконвала стральбу стоячы. Дамрачова пуляла, а мішэні на яе шчырае здзіўленне ўсё не зачыняліся. У выніку давялося скончыць гонку датэрмінова. Затое пасля Дамрачова даказала сваю псіхалагічную ўстойлівасць. У эстафеце яна была абсалютна лепшай на сваім другім этапе (нашы занялі ў выніку 8-е месца), а ў спрынтарскай гонцы дасягнула першага ў сваёй кар'еры п'едэстала на этапах Кубка свету ў індывідуальнай намінацыі. На рахунку Дамрачовай бронзавы медаль. Вышэй яе апынуліся толькі немкі Магдалена Нойнэр і Каці Вільхельм. У наступным спаборы — у пасьюце (так па-іншаму называюць гонку пераследу) — Дар'я бліскуча прайшла першы этап, стаўшы на некаторы час лідарам. Але на адной са стрэльбаў стоячы ажно тройчы не трапіла ў мішэнь і ў выніковым пратаколе адкацілася на 10-е месца. У агульным заліку этапаў Дамрачова ідзе пакуль 11-й, у трыццатку мацнейшых уходзіць таксама Вольга Кудрашова — яна 28-я. У нашых мужчын поспехі больш сціплыя. У зводнай табліцы лепшы з беларусаў Рустам Валіулін займае 25-ты радок. Сяргей Новікаў пакуль 33-ці. Таму трэнерскі штаб і праводзіць зараз эксперыменты, выпускаючы на трасу юніёраў. Відавочна, што хуткага поспеху ад беларускіх біятланістаў мужчын пакуль чакаць не даводзіцца.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Аплатка і куцця ў Сопаце

Як штогод, так і зараз беларусы Трыгарада, Прымор'я, студэнты з Беларусі, якія вучацца ў трыгарадскіх вышэйшых навучальных установах і адзін сябра беларусаў, радавіты швед Бо Ольсан спаткаліся ў сядзібе „Хаткі" ў Сопаце па вуліцы Гафнера, каб падзяліцца аплаткай і куццёй.

Найсамперш старшыня „Хаткі" Лена Глагоўская (на здымку ў цэнтры) зачытала святочныя і навагоднія віншаванні ад сяброў, якія не забываюць нас тут: ад Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына", ад Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхася Аляксейчыка, ад прэзідэнта Гдыні, ад бібліятэкараў Ваяводскай і Гарадской публічных бібліятэк у Гданьску і ад старшыні Управы Радыё „Рацыя" Яўгена Вапы і яго намесніка Пятра Янкоўскага. А потым пры багатым застоллі віншаванням і ўспамінам не было канца. Перш за ўсё моладзь была зацікаўлена святкаваннем Каляд у мінулым, сягаючым даваенных часоў у беларускіх вёсках ваколіц Глыбокага і Астравецкага раёна. Пра мінулае цікава апавядалі Уладыслаў Страшэвіч і Чэслаў Мекін.

З Навагоднімі прывітаннямі —

Міхась КУПТЭЛЬ

Прамоцыя!!! Дарма!!!

Як жа часта бачым гэтыя словы на розных рэкламах, упакоўках ці паліцах магазінаў! Вакол нас — самі дабрадзеі. Купляеш сёння — ашчаджаеш! Бярэш дзве ўпакоўкі — трэцюю атрымаеш бясплатна! Нічога, што табе ніводнай не трэба — плаці і пра нішто не пытай. А ўжо ў ніякім выпадку не прабуй нічога пералічваць! Бо тады чорна па белым акажацца, што бясплатна цябе падманулі, а прамоцыя была карыснай толькі для прадаўца, а не для кліента. Пакуль напісаць гэтыя словы, пайшоў я ў вялікі магазін з калькулятарам у руцэ і праверыў рэкламныя „скідкі" на фруктавых соках, газіраваных напітках, пральным парашку і маянэзе. Варта было гэта зрабіць, бо дзякуючы гэтаму я назаўсёды вылечыўся ад даверу для прадаўцоў.

Хаця ўцэнкі ў магазінах бываюць, не скажу. Напрыклад, па прычыне канца тэрміну прыгоднасці прадукту (гэта таксама чарговая недарэчнасць, бо кожны прадукт мусіць мець такі тэрмін, але скажыце, чым розніцца старая каменная соль ад свежай). Аднак бываюць прадукты яшчэ зусім добрыя, прадатныя для спажывання, напрыклад, сычужныя сыры. Тады варта такія прадукты купіць і гэта будзе сапраўдная нагода пакарыстацца ўцэнкай. Аднак такія сітуацыі здараюцца надта рэдка.

Найчасцей сустракаемся з нахабным абманам. Для вытворцаў і прадаўцоў пакупнікі — статак бараноў, якім усё можна ўнушыць. На жаль, часта пакупнікі так сябе паводзяць. І толькі ад нас саміх залежыць, ці можна будзе нас прылічыць да гэтых бараноў. Ніхто ад добрага сэрца нічым з намі не дзеліцца — гэта мы дзелімся сваімі грашыма з рознымі, малымі і вялікімі, спрытнюгамі. Забываем, што добры тавар не патрабуе такога тыпу рэкламы, а дармовым бывае толькі сыр у мышынай пастцы.

М. Ц.

Вітаем у крузе сяброў

У 1 нумары „Нівы" ад 4 студзеня друкаваўся тэкст Мікалая Панфілюка „Авангард «Нівы»", у якім аўтар дае ацэнку супрацоўнікам „Нівы" (раней падобнае пісаў Васіль Сакоўскі). Вельмі добра, што ў крузе даўнейшых супрацоўнікаў адраджаюцца пачуцці летапісцаў. Гэта зручны момант для таго, каб пашырыць круг супрацоўнікаў „Нівы". На маю думку, у кожнай гміне, дзе пражывае беларускае насельніцтва, павінен знайсціся прынамсі адзін чалавек, які інфармаваў бы „Ніву" аб буднях лакальнай грамадскасці, дасылаў звесткі пра поспехі і праблемы звычайнага чалавека. Жменька журналістаў не зможа даехаць да адлеглых мясцін. Наш абавязак — дапамагчы ім. Пакіньма затым узаемныя крыўды, якія, мабыць, нясем у сэрцы за словы выказаныя раней у допісе ці рэпліцы. Гэтыя словы пасылаю ў адрас паважаных калег Мікалая Панфілюка, Валянціна Семенюка ці Васіля Петручука. Не стану дашуквацца прычын даўжэйшага перапынку ў іхнім супрацоўніцтве. А наконт Панфілюка лічу, што пасля ўспамянутага тэксту будуць наступныя. А тэмаў у Дубіцкай гміне — хоць адбаўляй. І таму ёсць магчымасць пісаць „налева і направа", як гэта канстатуе паважаны Мікалай Панфілюк. Вельмі добра было б, каб на мой заклік адазваліся і Марк Цыбарт, і Грыша Мароз. Лічу, што з пачаткам гэтага года далучыцеся да нас, паважаныя калегі, каб прадоўжыць пісаць летапіс нашай Малой айчыны — Беласточчыны.

Уладзімір СІДАРУК

У Нараўчанскай гміне

Іх кроў ратуе

У Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) да найактыўнейшых пачэсных донараў належаць м.інш. Ян Зданоўскі з Плянты (аддаў ён 18 літраў крыві) і Багуслаў Савіцкі з Барнацкага Моста (12 літраў), а таксама Кшыштаф Цэха і Данель Кот з Плянты, Міраслаў Кардаш з Ахрымоў ды Мечыслаў Грыц, Генрык Лясота і Марцін Валкавыцкі з Нараўкі (яны аддалі па 6 літраў „дару сэрца").

Усе яны атрымалі рэчавыя ўзнагароды, якія ўручылі ім старшыня Рады гміны Нараўка Андрэй Мядзведзь ды войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч падчас сесіі Рады гміны 30 снежня 2008 года.

* * *

З „Нівай" да людзей

У Нараўчанскай гміне „Ніву" можна купіць на пошце ў Нараўцы або ў крамах ГС. Нам, карэспандэнтам, неабходна дапамагчы, каб людзі купілі наш часопіс. Як? Трэба шукаць для гэтага нагоды.

Вось я і сакратар Гміннай управы ў Нараўцы былі ў гайнаўскім беларускім ліцэі на семінары, прысвечаным магчымасцям увядзення двухмоўных назваў на Падляшшы. Калі ў „Ніве" паявілася публікацыя пра гэты семінар, я запрапанаваў прачытаць яе сакратару. І ён купіў „Ніву".

Іншы прыклад. Напісаў я допіс „Ляўкова зімою". Пахваліў аднасяльчан, якія рупліва расчышчаюць ад снегу новапабудаваны тратуар. І што ж вы думаеце! „Ніва" не паляжала на паліцах у крамах у Старым Ляўкове і ў Плянце. Яе адразу купілі Яўген Смольскі, Тэрэса Саковіч, Сяргей Семаковіч і Юры Казлоўскі з Новага Ляўкова. Вось, аказваецца, людзі „Ніву" купяць. Дзеля гэтага трэба іх аднак, заахвоціць!

* * *

Мая парафіяльная царква

У Гайнаўцы завяршыўся мастацкі конкурс пад загалоўкам „Мая парафіяльная царква" для дзяцей і моладзі. Удзельнічалі ў ім вучні з 11 мясцовасцей. Рысавальшчыкі паказалі прыгажосць царкоўнай архітэктуры.

У катэгорыі дашкольнікаў за малюнак першае месца атрымала Анэта Цырук з гайнаўскага прадшколля № 3. У катэгорыі I-III класаў першынство заваяваў Яцак Дружба з Пачатковай школы № 5 у Гайнаўцы. У катэгорыі IV-VI класаў пачатковай школы раўнапраўнае першае месца занялі Пётр Штэрлінгаў і Аляксандра Грыгарук з ПШ № 6 у Гайнаўцы. У катэгорыі гімназістаў найлепшы малюнак атрымаўся ў Маргарыты Іванюк з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. У катэгорыі сярэдніх школ першае месца ўзяла Беата Алексяюк з Комплексу агульнаадукацыйных школ імя Марыі Складоўскай у Гайнаўцы. Віншуем! **(яц)**

Адгаданка

				1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афрыканскую пагаворку.

1. частка рухавіка парахода ў выглядзе лопасцей, замацаваных на вале = 7 _ 8 _ 3 _ 22 _;
2. дзяржава з Капенгагенам = 2 _ 1 _ 12 _ 11 _ 13 _;
3. школьнае памяшканне = 18 _ 16 _ 6 _ 9 _;
4. туша з забітай жывёлы, якая ідзе ў ежу = 14 _ 17 _ 21 _ 15 _;
5. пецярбургская рака = 5 _ 4 _ 23 _ 24 _;
6. бацька царэвіча = 10 _ 19 _ 20 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

Беларуска, рыс, прычт, шпік, церам, Ітака, фільц, собаль, трэнд, Юм, Ржэў, Гарбачоў, Кобе, самец.

Рашэнне: **Лепш страціць абед, чым мець сотню ўрачоў.**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 560 egz.

Музыка жыцця і Эндзі Уорхал

Тэкст і фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Няма ў цябе ўжо выбару, — напісала мне Ася, — бач, нават выстаўку Эндзі Уорхала спецыяльна, пад твой прыезд, наладзілі!

У нас рэдка калі сыходзіліся тэрміны для сутрэч за акіянам, заўсёды ў мяне нешта выскачыць — ці то экзамены ў дачкі, праекты „Зоркі", праца над новай кніжкай... У яе таксама былі абмежаваныя магчымасці для сустрэч у Манрэалі. Больш за палову года яна разам з сям'ёй жыве сярод інуітаў у раёне Нунавік на поўначы Канады. Побач працы ў тамтэйшай школе, вядзе яна навуковыя доследы над культурна-адукацыйнымі вуснымі пераказамі інуітаў. Дабрацца туды не надта зручна, найперш таму, што білет з Манрэаля ў яе паўночны пасёлак Куйюарапік каштуе два разы больш, чым з Польшчы ў Канаду. У зімовы час страшна ехаць без палярнай падрыхтоўкі і валёнкаў. Там, зараз ля вёскі, круціцца белы мядзведзь, маразы даходзяць да сарака градусаў...

Ася — мая наймалодшая сястра. Напрыканцы верасня яна нарадзіла дзіцятка і на час родаў разам з сям'ёй перасялілася ў Манрэаль. І я, згодна з нашай падляшскай этнамудрасцю, паляцела да яе ў адведкі, каб сказаць: *Ой, якое брыдкае дзіця ў вас нарадзілася!* Яшчэ больш мне хацелася заспяваць хрысцінныя песні маленькім пляменіцам Марыі і Тамары. У гэтым я абавязана канадскаму швагру. Ян вывучыў беларускую мову і ўсе нашы песні тыпу: „Туман ярам", „Купалінка", „Тапаля"... Дзякуючы яго асобе, у старой хатцы маіх бацькоў зноў ажылі гучныя спевы з гармонікам, гітарай. Словам, вярнулася прага жыць.

Эндзі Уорхал мае таксама тут сваю ролю.

* * *

— Я ведаў Эндзі Уорхала як мастака, скульптара, дызайнера, прадзюсера фільмаў, рэжысёра, фатографа і як спеца па шмат чым іншым, — разважае з характэрнай сабе тэатральнасцю Сцяпан Аквін, куратар выстаўкі „Warhol Live", — ніколі аднак я не думаў пра яго як музыканта або танцора...

Гэты сказ найбольш трапна характарызуе выстаўку ў Музеі прыгожага мастацтва ў Манрэалі (25.10 — 18.01.2009 г.). Праект у непрыкметны, хоць у рашучы спосаб, мяняе наш погляд на самога Уорхала і адначасова стан сучаснай культуры. Ідзе пра перамяшчэнне выпрацаваных еўрапейска-габрэйскай цывілізацыяй стандартаў. Тут напачатку музыка. Затым ідуць рух, колер, карціна-ікона, фільм, візія. Слова пастаўленае дзесьці ў канцы! І найчасцей з'яўляецца адно каментарыем да пачутага і пабачанага...

Праўда, такая ператусоўка зараз не здзіўляе. Пра іншае і не гавораць у сучасных інтэлектуальна-мастацкіх кругах. Феномен Уорхала заключаецца ў дары прароцтва. Ён пабачыў сучасны воблік культуры ўжо палове 60-х гадоў XX стагоддзя і выявіў яго ў сімвалічным вобразе серыйна здубляваных долараў...

Такі вобраз культуры, без аглядкі, папулярызуюць зараз амаль усе медыі. У час вандроўкі ў горад Квебек я пазнаёмілася з журналістам канадскай штодзённі з традыцыяй двухсотгадовай даўнасці. Ніколя, абітурыент факультэта літаратуры, піша пра культуру. Кажа, што сярод адведзяных для культуры старонак, музычныя тэмы займаюць больш за палову плошчы.

Тамара Кандрацюк-Бро ў падляшскай хустцы бабулі

На другім месцы — фільм. Паэзія і літартура — сапхнутыя ў непрыкметнае месца. Прытым рэцэнзіі на кніжкі пішуцца на мове рэкламы.

У Канадзе, як мала дзе яшчэ на свеце, моцны тэатр. З'яве садзейнічаюць шматлікія тэатральныя фестывалі і адукацыйныя праграмы. Таму там высокі прэстыж тэатральнага слова, вылучэнне ад правіла.

* * *

У мяне з сястрой усё пераклікаецца, дапаўняецца. Эндзі Уорхал з'явіўся ў нашых лістах-гутарках восенню 2005 года. Я толькі што вярнулася з радзімы поп-караля і публікавала ў „Ніве" карпацкі цыкл рэпартажаў. Нарысы пра Эндзі Уорхала я пісала ў вялікай ступені з думкай пра яе. Ейныя допісы заўсёды мяне натхнялі вобразнасцю мовы і гумарам, характэрным нашым аўтахтонам-падляшукам. Часта яе назіранні заходняй цывілізацыі жыва намапіналі каментарыі Уорхала. Карпацкае падарожжа выпала на спякотны злом ліпеня і жніўня, калі мы разам з Дыянай І. і Тэрэзай С. дабраліся ў вёску Мікова, што ў Славакіі. Адсюль выводзяцца продкі амерыканскага караля попарта. У Міковай захаваўся адно панадворак, на якім нас чакалі *сеансы* родам з Сярэбранай фабрыкі (апісаныя ў цыклі „Цыганскае сонца Карпатыі"). Мы самі назіралі за модай праваслаўных жанчын, якая падалася нам свойска-падляшска-праваслаўнай. У падобным стылі насілася і маці Эндзі Уорхала, якая дачакалася партрэта-іконы, а якую крытыкі мастацтва ставяць на роўні з карцінай Мэрлін Манро. На ім пабачым старэнькую бабульку-славянку ў хустцы на галаве. Сам мастак гаварыў пра маці як пра альтэр-эга. Праўда, тады мы не думалі пра музычныя захапленні Уорхала. У гэтым плане ярка вылучалася яго маці. Яшчэ да замужжа Юлія (з дому Завадская) вандравала як спявачка цыганскай тэатральнай трупы па карпацкіх мястэчках і вёсках. І ў Пітсбургу, дзе пачаткова пасяліліся бацькі мастака, запамяталі яе як апірышча русінска-карпацкай традыцыі. Не было тады хрысцін, вяселля ці мярлінаў без яе спеваў...

(працяг будзе)

25.01 – 31.01

(22.03. — 20.04.) Кіпіш энергіяй! Зачаруеш кожнага, хто табе трапіць у вока! Пачатак тыдня — найлепшы час на сустрэчы і любоўныя заваёвы. 25-29.01. пачнеш сабе лішне абяцаць або зарана прыступіш да нейкіх мерапрыемстваў. Будзь больш памяркоўным!

(21.04. — 21.05.) Мілыя гасціны, прыёмы, банкеты, урачыстасці. Найбольш часу прысвяці кампанейскаму жыццю. Хоць будуць сітуацыі поўныя напругі і няўпэўненасці. Будзь асцярожны асабліва на працы.

(22.05. — 22.06.) Час збірання плёнаў, падагульненняў, але і дробных параз, якія прымусяць цябе да рэвізіі сваіх планаў і напрамкаў. Ты зноў поўны энергіі і запалу, ахвотны да правядзення хуткіх змен.

(23.06. — 23.07.) Пазбягай новых фінансавых абавязацельстваў. Не бяры крэдытаў, не пазычай і не абяцай зашмат па зменах, да якіх хтосьці будзе цябе намаўляць. Хоць стаянне ў месцы гэта крок назад!

(24.07. — 23.08.) Чакае цябе вялікая змена. Выплывеш на шырокія воды, падасіся незвычайным здарэнням. Апрача поспехаў могуць спасці на цябе дробныя паразы (прычына гэтаму — абручовае зацьменне Сонца 26.01., найлепш бачнае ў Інданезіі).

(24.08. — 23.09.) Найважнейшая для цябе — самастойнасць. Паставіш на ўласную ініцыятыву і перастанеш баяцца, што сам не справішся. Твая непасрэднасць зробіць маланкавае ўражанне на іншым поле. Поспехі залежаць будуць ад тваёй працаздольнасці і прыярытэтаў, якім ты будзеш верны.

(24.09. — 23.10.) Да 27.01. ненайлепшы настрой, клопаты ў фінансах. Не рабі нічога супраць закону! Не хапай сарака сарок за хвост, засяродзься на самым важным. Старайся не ўваходзіць у сувязі, якія з'яўляюцца невядома чым — сяброўствам, каханнем ці чым яшчэ іншым.

(24.10. — 22.11.) Да 28.01. праблемы ў пары; можаце не дагаварыцца ў найбольш празаічных справах (калі хочаш пазбегчы праблем, моцна пастарайся!). Магчымы прыкрыя сітуацыі, непрыемныя весткі ці работа. Свае справы паладзіш так, каб як найменш пакутаваць. Магчымае саперніцтва з сябрамі — даказванне сваіх заслуг, кампетэнцый ці прафесіяналізму; калі ў гэтай гульні страціце дыстанцыю, можаце сябе моцна параніць!

(23.11. — 22.12.) Да 26.01. добры настрой, задавальненне, шмат шчасця. 27-31.01. — непаладкі на працы, запальчывасць, спрэчкі, праблемы са здароўем; не прымушай сябе да нічога. Не спалучай пачуццяў і грошай.

(23.12. — 20.01.) Будзеш баявіты і бескампрамісны, нават у адносінах да сябе самога. Да 27.01 — цяжкі час для пачуццяў. Адчуванне зняволення партнёрам, а ён папракне цябе ў абыякавасці да яго, недахопе тваіх стараннаў.

(21.01. — 19.02.) Шчасце ў каханні, упэўненасць. Не будзеш наракаць на недахоп грошай, дазволіш сабе маленькія прыемнасці. Зацьменне Сонца (26.01.) прынясе табе паніжэнне настрою, каламуць у галаве, недахоп талковых ідэй. 27-31.01. паявіцца канфлікт паміж сямейнымі інтарэсамі і ўласнымі патрэбамі (кампраміс будзе цяжка дасягнуць).

(20.02. — 21.03.) Сустрэнеш вельмі цікавую асобу (унясе яна ў тваё жыццё шмат свежасці). Больш часу чым у хаце правядзеш з сябрамі (планы наконт супольнай будучыні маюць шанц поўнасцю зрэалізавацца). Пазітыўнае стаўленне прынясе плён у выглядзе таксама дасканалай фізічнай формы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960